РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЛЮТАГА 2025 г. АЎТОРАК № 28 (30416)



# ЗГОДА. ПАВАГА. РАЗУМЕННЕ

**Гэта формула, якую беларуская дзяржава выпрацавала разам з усімі вядучымі рэлігійнымі канфесіямі нашай краіны. Яна — абярэг нашага спакойнага жыцця, нашай стваральнай працы, калі мы ўсе, незалежна ад веравызнання, разам ствараем добрае сёння і яшчэ лепшае заўтра нашай агульнай любімай Радзімы — Беларусі. Аб гэтым, а яшчэ аб тым, як захаваць мір і спрадвечныя каштоўнасці народа, ішла ўчора ў фармаце шчырага, даверлівага дыялогу размова Прэзідэнта з кіраўнікамі асноўных рэлігійных канфесій.**

(Працяг на 2–3-й стар.)




АДУКАЦЫЯ

# ПЕРАД ВЯЛІКІМ СТАРТАМ

**Рэпетыцыя цэнтралізаванага экзамену патрэбна для таго, каб выпускнікам было лягчэй на самім ЦЭ**

У мінулую суботу навучэнцы 11 класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі адрэпеціравалі адну з галоўных падзей у сваім жыцці — цэнтралізаваны экзамен, які вызначыць іх далейшы шлях і дасць пуцёўку ў будучыню. Падобная рэпетыцыя карысная не толькі ў практычным плане — праверыць свае веды, але і ў псіхалагічным — пасля яе будучы выпускнік умее «арыентавацца на мясцовасці» і на ўласным досведзе ведае ўсе нюансы арганізацыі экзамену.

СТАР. 8–9

ЯК НЕ ТРАПІЦЬ У ПАВУЦІННЕ МАХЛЯРОЎ? 7



УБАЧЫЦЬ ГІСТОРЫЮ ГРОДНА Ў ЧАРЦЯЖАХ 13



**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

TURЫЗМ

# ПА КРАІНЕ — ЗА ЎРАЖАННЯМІ

**Як адпачыць і выйграць конкурс «Пазнай Беларусь»**



Ужо ў 23-і раз у нашай краіне стартаваў Рэспубліканскі турыстычны конкурс «Пазнай Беларусь». І калі пачынаўся ён у 2003 годзе ўсяго з 50 заявак, то летась іх даслалі 1772 удзельнікі. Конкурс сапраўды стаў вельмі масавым, а многія яго намінацыі — «народнымі». Іх, дарэчы, у апошнія гады прапануецца больш за дзясятак, што дазваляе ўдзельнічаць як звычайным людзям, якія любяць падарожнічаць, так і прафесіяналам турыстычнага рынку. Усё гэта дае магчымасці спазнаваць сваю краіну, яе гісторыка-культурную спадчыну, папулярызаваць актыўны адпачынак і здаровы лад жыцця, а таксама стымуляваць выкарыстанне сучасных тэхналогій.

СТАР. 8–9

ISSN 1990 — 763X
25028
9 771990 763008

# «МІР — ГЭТА ЗВЫШКАШТОЎНАСЦЬ НАМ ВАЖНА ГЭТЫ МІР

**Унікальная беларуская формула: павага — разуменне — згода.**

Сустрэча за круглым сталом у атмасферы адкрытасці і даверу прайшла ў Палацы Незалежнасці. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прадстаўнікамі васьмі рэлігійных канфесій. Такое шырокае раўнапраўнае прадстаўніцтва не дзіўнае, бо, як заўважыў кіраўнік дзяржавы, у сваёй найноўшай гісторыі беларуская зямля не ведала рознагалоссяў і пераследаў па рэлігійнай, нацыянальнай ці расавай прыкмеце.



Фота БелТА.

## КРАЙ АДКРЫТЫХ ДУШ І АДЧЫНЕНЫХ ДЗВЯРЭЙ

**«Усе канфесіі жывуць тут у атмасферы ўзаемнай павагі, міру і згоды. У нашы дні гэта дзіўна для многіх, у тым ліку «цывілізаваных» краін. Суіснаванне хрысціянства, ісламу, іўдаізму і іншых рэлігій, асновы якіх не супярэчаць глыбінным каштоўнасцям беларускага народа, згуртавала і загартавала беларускую нацыю», — адзначыў Прэзідэнт.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што беларусы заўсёды адкрытыя да тых, хто прыходзіць да нас з дабром. «Так будзе заўсёды», — канстатаваў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў Беларусі ніколі не перашкаджалі замежным паломнікам, якія едуць пакланіцца нашым святыням. «Мы дапамагаем людзям, якія трапілі ў бяду, перш за ўсё бежанцам. Але пры гэтым, не шкадуючы ўласнага жыцця, гатовы даць рашучы адпор ворагу. Так бывала не раз у нашай тысячагадовай гісторыі», — сказаў ён.

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што 2025-ы — год юбілею Вялікай Перамогі. І ў Беларусі добра ведаюць, што ў час Вялікай Айчыннай вайны нашу зямлю абаранялі прадстаўнікі розных веравызнанняў. «Мы разам перамаглі фашызм і здабылі мір, змацаваны крывёй шматлікіх народаў. І вельмі гэтым мірам даражым. Нездарма ў Беларусі існуе традыцыя супольнай міжрэлігійнай малітвы менавіта аб міры. Я заўсёды кажу: мір — гэта звышкаштоўнасць для ўсіх народаў. Нам важна гэты мір зберагчы», — сказаў беларускі лідар.

Па словах кіраўніка дзяржавы, у краіне сёння склалася ўнікальная этнаканфесіянальная мадэль, якая магла б стаць прыкладам для многіх. «Мы разам — дзяржава і прадстаўнікі ўсіх канфесій — вывелі агульную формулу: павага — разуменне — згода. Наш народ прывык жыць менавіта так і нават не ўяўляе сабе жыцця інакш. Хаця бывае. Мы з болем у сэрцы бачым, да чаго дайшла сітуацыя ва Украіне, напрыклад. Нас таксама спрабавалі разгайдаць у 2020 годзе, у тым ліку і па рэлігійных пытаннях. Невыпадкова адзін з найматнейшых інфармацыйных удараў быў нанесены менавіта па святарах», — згадаў Прэзідэнт.

Звяртаючыся да святароў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цяжка пераацаніць плён іх служэння на ніве ўмацавання традыцыйных каштоўнасцяў. «Вы ўзводзіце нябачны, але ад таго не менш надзейны духоўны шчыт паміж дабром і злом. І ў далейшай сумеснай рабоце мы будзем абапірацца на сямейныя і духоўныя каштоўнасці, разам выхоўваць дзяцей».

Ён расказаў, што гэта сустрэча была запланавана напярэдадні выбараў, але было вырашана перанесці на паслявыбарны перыяд, каб пагаварыць аб праблемах і паказаць, што гэта не палітычная акцыя або спроба ўздзейнічаць на людзей праз святароў.

## «ПАВІНЕН БЫЦЬ НАЙВАЖНЕЙШЫ ХРАМ»

Прэзідэнт расказаў аб тэме, якая яго хвалюе і якой ён жыве, калі размова ідзе аб рэлігійным развіцці. Ён нагадаў, што ў гэтым годзе будзе прыведзена ў парадак праваслаўная святыня — Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр. Гэта будзе цэнтр праваслаўя. «У сувязі з гэтым я прапаноўваю і абяцаю (калі вы прымеце рашэнні): мы павінны нашым канфесіям стварыць адпаведныя цэнтры», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, такія цэнтры павінны быць адкрытыя, прасторныя, даступныя для вернікаў. «Дзяржава гатова падставіць сваё плячо», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. Ён паабяцаў, што дапамога ў стварэнні такіх цэнтраў будзе аказана ўсім канфесіям.

«Храмаў шмат. Але павінен быць найважнейшы храм, святыня, куды б маглі прыходзіць людзі не толькі з Беларусі, не толькі нашы суседзі, але і з далёкага замежжа. Таму падумайце і ўнясіце прапановы», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён не сумняваецца, што гэту ідэю падтрымае грамадства, бо яна працуе на адзінства. «Мы створым цэнтры прыцягнення нашых вернікаў, да якой бы канфесіі яны ні належалі, — сказаў беларускі лідар. — Вы аднолькава дарагія для дзяржавы, для мяне. І я буду рабіць усё для таго, каб вы жылі ў міры і згодзе».

Прэзідэнт зазначыў, што ў Беларусі склаўся канфесіянальны мір. І прызнаўся, што для яго гэта пэўны гонар, таму што такога міру ні ў адной краіне няма. І такія цэнтры гэта замацуюць.

## ПРАВАСЛАЎНЫЯ. АГУЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ, ЯКІЯ АБ'ЯДНОЎВАЮЦЬ



**Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін** павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з перамогай на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. «Гэта для нас усіх вельмі важна, значна, і мы сардэчна вас віншуем. Вынікі выбараў сведчаць аб вернасці выбранага шляху ў развіцці краіны, высокім узроўні даверу і згуртаванасці нашых грамадзян, якія любяць сваю Радзіму, цэняць парадак і мір. Але, што яшчэ больш важна, вынікі выбараў азначаюць захаванне міру і стабільнасці на беларускай зямлі ў той час, калі чалавецтва ўсё глыбей увязваецца ў бездань міждзяржаўных і глабальных канфліктаў. Забеспячэнне міру і згоды паміж людзьмі, зберажэнне духоўных каштоўнасцяў народа, маральнай чысціні — гэта і ёсць мэта служэння праваслаўнай царквы», — сказаў ён. Мітрапаліт падкрэсліў, што палітыка дзяржавы ў духоўна-маральным выхаванні адпавядае каштоўнасцям праваслаўя і ў сваю чаргу царква робіць усё магчымае, каб зберагчы тое, што стагоддзямі вызначала сутнасць нашага народа.

«Як вядома, мноства людзей стала новіцца народам дзякуючы агульнай памяці. А памяць найбольш моцна захоўваецца і перадаецца ў сям'і. Таму роля сям'і важная не толькі ў вырашэнні дэмаграфічных праблем, але і ў патрыятычным выхаванні», — падкрэсліў мітрапаліт Веніямін. Царква прапаноўвае бачыць у сям'і не фактар, які абмяжоўвае свабоду, а рэальнасць, якая дорыць чалавеку радасць, набыццё сэнсу жыцця, магчымасць духоўна ўзрастаць. Мітрапаліт заўважыў, што сямейныя каштоўнасці часткова страчаны, таму так важна сёння прапанаваць моладзі вобраз дружнай, моцнай сям'і, але пры гэтым не кідацца ў архаіку, а ўлічваць сучасныя тэндэнцыі і нацэльвацца на будучыню.

Прэзідэнт у адказ сказаў, што перамога на выбарах — гэта агульнае дасягненне. «Мы правялі выбары, як не праводзяць нідзе. Я марыў аб гэтым, і гэта адбылося. Ціха, спакойна. Людзі прыйшлі і здзівілі ўсіх, хто прыехаў назіраць за гэтымі выбарамі. Прыемна здзівілі. Выбары — гэта сведчанне таго, што мы зрабілі высновы са сваіх памылак, якія дапускалі ў нашым грамадстве і я, і ўлада, і вы ў тым ліку. Мы правялі добрую работу над памылкамі», — заўважыў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсе традыцыйныя каштоўнасці беларускага народа замацаваны ў Канстытуцыі, некаторыя нават з падачы духавенства.

**«Правілы нашага жыцця, замацаваныя ў Канстытуцыі, для ўсіх, яны глыбінныя. Яны выходзяць ад разумення нашым грамадствам, нашым народам таго, дзе мы знаходзімся, і акрэсліваюць арыенціры, на якія мы павінны глядзець пры нашым руху наперад. Я вельмі спадзяюся, што гэта так», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

## КАТАЛІКІ. АГУЛЬНЫЯ ЗАКЛІКІ ДА МІРУ



На сустрэчы выступіў **Мітрапаліт Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкай царквы ў Рэспубліцы Беларусь, старшыня Канферэнцыі каталіцкіх епіскапаў Беларусі Іосіф Станеўскі.** Ён адзначыў, што 2025-ы — год 80-годдзя Вялікай Перамогі — час глыбокага пераасэнсавання гісторыі нашага народа, адважнага і непахіснага, які захаваў традыцыйныя каштоўнасці і чалавечнасць. «Час выбраў нашых продкаў для перамогі. Нас — для захавання міру і стваральнай працы», — падкрэсліў Іосіф Станеўскі. 2025-ы для католікаў — юбілейны год хрысціянства. «Пачалі мы яго паўночным урачыстым богаслужэннем з малітвай за Айчыну і скончым малітвай за Беларусь і мір ва ўсім свеце ў Нацыянальным санктуарыі Маці Божай у Будславе», — адзначыў мітрапаліт Іосіф Станеўскі. Ад імя ўсіх вернікаў ён падзякаваў Прэзідэнту за дапамогу ў аднаўленні святыні пасля пажару.

Мітрапаліт звярнуў увагу, што Беларусь — гэта наш агульны скарб, духоўны, культурны, гістарычны. І таму адказнасць за мірнае неба над галавой — агульны клопат. За апошнія 80 гадоў каталіцкая царква выпрацавала сваё вучэнне аб міры. У ім братэрства і дыялог выведзены як асноўныя інструменты дасягнення міру. Іосіф Станеўскі адзначыў, што Папа Рымскі Францыск крытыкуе «культуру сцен» і заклікае да «культуры мастоў» у пераадоленні рознагалоссяў. «Пазіцыя Папы Францыска цалкам супадае ў сваіх прапановах аб устанаўленні міру і добрасуседства, з якімі вы неаднаразова звярталіся да сусветнай супольнасці, і перш за ўсё да нашых суседзяў», — адзначыў Іосіф Станеўскі. Ён падкрэсліў, што менавіта з такімі пасыламі рэалізоўвае свае праекты каталіцкая царква ў Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка вельмі рады таму, што католікі Беларусі

# ДЛЯ ЎСІХ НАРОДАЎ. ЗБЕРАГЧЫ»

## Падрабязнасці шчырай размовы ў Палацы Незалежнасці

лічаць Будслаўскі касцёл сваёй святыняй. Ён зазначыў, што часта наведвае праваслаўныя храмы, але хацеў бы пабываць у цэнтрах іншых канфесій, праводзіць там сустрэчы. Беларускі лідар расказаў, што вельмі паважае Папу Францыска. «Прашу, перадайце яму самыя добрыя пажаданні. Гэта сапраўды моцны чалавек. Чалавек, які не проста жыве і служыць. Ён умее гаварыць проста ў вочы тое, што думае, для прадстаўнікоў усіх слаёў насельніцтва», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён выказаў надзею на хуткую сустрэчу з дзейным Папам Рымскім.

### ХРЫСЦІЯНЕ ВЕРЫ ЕВАНГЕЛЬСКАЙ. СУМЕСНАЯ ПРАЦА НА КАРЫСЦЬ ГРАМАДСТВА



На сустрэчу таксама былі запрошаны прадстаўнікі рэспубліканскага рэлігійнага аб'яднання «Аб'яднаная Царква хрысціян веры евангельскай». **Епіскап аб'яднання Леанід Бірук** расказаў, што хрысціяне веры евангельскай удзяляюць вялікую ўвагу сацыяльнай дзейнасці. У першую чаргу — дапамозе людзям, залежным ад алкаголю і наркотыкаў. Сёння пры Царкве хрысціян веры евангельскай створана 15 рэабілітацыйных цэнтраў, якія працуюць з такімі людзьмі. Пасля года рэабілітацыі і паўгода адаптацыі прыкладна 75 % людзей не вяртаюцца да ранейшага ладу жыцця. Леанід Бірук адзначыў, што гэта работа вядзецца ў супрацоўніцтве з органамі ўнутраных спраў, установамі аховы здароўя і сацыяльнай абароны. «Гэта агульная справа для таго, каб гэтыя людзі сталі годнымі грамадзянамі сваёй краіны. Яны ствараюць сем'і, дапамагаюць людзям у такой самай сітуацыі, у якой былі яны. У нашых цэрквах мы вучым вернікаў патрыятызму. У нашым вучэнні ёсць словы аб тым, што хрысціянін пакліканы любіць сваю краіну і ўсё, што складае яе, — род, культуру, гісторыю. Мы таксама ведаем вашы патрабаванні аб тым, што датычыцца дысцыпліны і адказнасці кожнага чалавека на сваім працоўным месцы. Мы разумеем: гэта залог працвітання нашай краіны. Мы вучым, што хрысціянін на любым працоўным месцы, якую б пасаду ні займаў, у якой сферы ні працаваў бы, павінен рабіць гэта адказна, як для Бога», — распавёў епіскап. Леанід Бірук адзначыў, што ў большасці прыхаджан Царквы веры евангельскай — шматдзетныя сем'і і падзякаваў дзяржаве за падтрымку такіх сем'яў.

Прэзідэнт падзякаваў Царкве веры евангельскай за дапамогу ў рэабілітацыі людзей, якія пакутуюць ад залежнасцяў, за ўвагу да шматдзетных сем'яў. «Гэта добрыя канкрэтныя дзеянні, накіраваныя на паляпшэнне атмасферы ў нашым грамадстве», — сказаў ён.

### ЧАС УСЁ РАССТАВІЦЬ НА СВАЕ МЕСЦЫ

**«Я заўсёды казаў, што ў кожнага свая дарога да храма і ніхто нікому не павінен перашкаджаць. Калі мусульманін хоча пайсці ў мячэць — ён туды пойдзе, яму перашкаджаць не трэба. Калі каталік прывык хадзіць у касцёл і хоча туды пайсці — ён туды пойдзе. Калі праваслаўныя хочуць у царкве памаліцца — няхай туды ідуць. Наша задача — дапамагчы чалавеку не знайсці (ён сам знойдзе сваю дарогу), мы павінны падтрымаць яго ў гэтым імкненні. І ніякага ціску тут быць не павінна. І гэта дапамагло нам. Таму мы маем такі міжканфесіянальны мір», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт абавязаны служыць свайму народу і рабіць тое, што хоча народ, сказаў Аляксандр Лукашэнка. Калі народ не хоча, а Прэзідэнт будзе рабіць наадварот, дык гэта зусім дрэнна. Па словах кіраўніка дзяржавы, бывае, што грамадства не вельмі разумее сітуацыю, і тады задача Прэзідэнта — пераканаць людзей, зрабіць усё, каб людзі зразумелі. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў пандэмію. «Як бы я ні імкнуўся да вас дастукацца і да сваіх людзей, я шчыра прызнаю, што не ўсе зразумелі тое, што адбывалася. Царква наша, любых канфесій, не адхіляе думку, што час усё расставіць на свае месцы. Час расставіў усё на свае месцы. І мы зразумелі, хто фінансаваў, колькі выдаткоўвалі на гэтую заразу, адкуль яна пайшла, колькі загінула людзей. І прызналі, што адзіна правільным быў шлях, які выбралі мы з вамі, — сказаў Прэзідэнт. — Ну не атрымалася ў мяне дастукацца да вас. І гэта адна з прычын, (няхай не самая галоўная), якой скарысталіся нашы праціўнікі, асобныя ворагі для таго, каб перавярнуць краіну. Мы таксама ўжо пра гэта ведаем, колькі на гэта і каму было ахвяравана грошай. Слухайце, калі б на справу пайшлі гэтыя грошы, мы б сёння не абмяркоўвалі ніякія праблемы нашых канфесій. Мы б і цэнтры пабудавалі для іх, і з наркаманіяй бы дапамагалі вам больш змагацца, шматдзетным дапамагалі б і гэтак далей і да таго падобнае».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што час не толькі расстаўляе ўсё на свае месцы, але і многіх вучыць. «У тым ліку і нас. Мы прызнаём і свае памылкі, якія мы дапусцілі. І вы павінны пагадзіцца з тым, што разам з намі недапрацавалі недзе. Не захавалі гэты мір на той час. Але над памылкамі папрацавалі, і сёння вынік: і грамадства, і народ з намі, і яны пацвердзілі гэта», — заявіў ён. А каб рухацца далей, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, не трэба ўвесь час абапірацца на аднаго чалавека, бо далей будзе складаней, чалавек не вечны. «Трэба, каб мы ўсе разам працавалі. А для таго каб было нармальна, павінна быць дысцыпліна», — параіў ён.

**Беларускі лідар звярнуў увагу, што дысцыпліна ёсць як панацэя кожнай канфесіі і з гэтага трэба браць прыклад. Але гэта не значыць, што трэба махаць шашкай. Усё проста і зразумела: калі рашэнне аб рэалізацыі ідэі прынята, — трэба яе рэалізаваць. І да гэтага павінны імкнуцца ўсе.**

Менавіта ў гэтым, паводле слоў Прэзідэнта, ён бачыць выключную дысцыпліну. У прыклад ён прывёў аграпрамысловы комплекс, прамысловасць, мікраэлектроніку і іншыя сферы, у якіх, каб не страціць напрацаваныя вынікі, патрэбна жалезная дысцыпліна.

### ЯЎРЭІ. АГУЛЬНЫ БОЛЬ І АГУЛЬНАЯ ПАМЯЦЬ.



**Галоўны рабін рэлігійнага аб'яднання абшчын прагрэсіўнага іўдаізму ў Рэспубліцы Беларусь Рыгор Абрамовіч** падзякаваў за магчымасць сустрэчы ў такім фармаце, дзе «ёсць магчымасць вучыць і вучыцца». Гаворачы аб дыялогу, рабін падкрэсліў, што міжканфесіянальны дыялог у нашай краіне — гэта прыклад мірнага і роўнага суіснавання прадстаўнікоў розных канфесій і этнасаў. «І ў радасці, і ў бядзе мы разам. І ў гэтым, хутчэй за ўсё, крыніца нашай, беларускай, сілы», — сказаў ён.

Рыгор Абрамовіч заўважыў: гістарычна склалася так, што яўрэі на беларускай зямлі адчуваюць сябе камфортна і спакойна. Ён адзначыў, што беларусы, якія страцілі ў гады Вялікай Айчыннай вайны кожнага трэцяга жыхара, як ніхто іншы разумеюць глыбіню трагедыі яўрэйскага народа. «Мы гэта цэнім, знаходзячыся на тэрыторыі Беларусі каля сямі стагоддзяў. На жаль, некаторыя нашы суседзі забылі, хто вызваліў Еўропу ад нацызму, які знішчыў шэсць мільёнаў яўрэяў», — сказаў ён. Як прыклад рабін прывёў нядаўнія памятныя мерапрыемствы, прысвечаныя 80-годдзю вызвалення Асвенціма, на якія не была запрошана афіцыйная беларуская дэлегацыя. «Не былі запрошаны нашчадкі тых, хто часам цаной свайго жыцця або рызыкуючы жыццём сваім, сваіх сем'яў ратаваў яўрэяў у гады Халакосту, у гады страшнай вайны», — сказаў равін.

Рыгор Абрамовіч звярнуў увагу на важнасць захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў: «Асновай міру і добрасуседства, на мой погляд, з'яўляецца сям'я. Я сам унук двух франтавікоў, якія вярнуліся з вайны, але не знайшлі свае сем'і (яны былі знішчаны ў 1941—1942 гадах). Яны не апусцілі рукі, адбудоўвалі Мінск і Барысаў. І заўсёды верылі ў дыялог паміж людзьмі, — сказаў рабін. — Абараніць каштоўнасць традыцыйнай сям'і — гэта задача для нас усіх: і для дзяржавы, і для грамадства, і для рэлігійных інстытутаў».

Асобна Рыгор Абрамовіч падзякаваў кіраўніку дзяржавы за дапамогу ва ўзнаўленні Валожынскай ешывы.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што, напэўна, ні ў адной краіне фашысты не знішчылі столькі людзей, як у Беларусі. І вельмі важна захоўваць гэту памяць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, прымаючы рашэнне па стварэнні мемарыяльнага комплексу «Трасцянец», настойваў на тым, што нельга дзяліць загінулых па нацыянальнасці.

Прэзідэнт распавёў і пра свой першы візіт у Ізраіль. «Нашы нягоднікі тут, асабліва з ліку нацыяналістаў, увесь час спрабавалі мне прыпісаць антысемітызм. Была разгорнута такая кампанія. Як ехаць у Ізраіль? Думаю: «Ну нічога, народ разумны, зразумеюць», — адзначыў ён. Але па прылёце ў Ізраіль беларускага лідара чакалі тысячы мясцовых яўрэяў. І сустрэча адбылася. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што на той сустрэчы абмяркоўвалі ўклад яўрэяў у перамогу над нацызмам. «Я выказаў сваё асабістае меркаванне аб тым, што яўрэі нідзе так не ваявалі, як у Беларусі. Трэба было — і помсцілі за сваіх загінулых суайчыннікаў, і ваявалі па-сапраўднаму. Па-нашаму, як бывае ў рускіх, беларусаў — славян. І, вы ведаеце, усе ўсталі і авацыяй гэта ўспрынялі. Вось так «антысеміта» сустракалі ў ізраільскай дзяржаве», — успомніў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што ў Беларусі вельмі шануюць гэтую гісторыю.

Кажучы пра Валожынскую ешыву, якая можа стаць цэнтрам іўдаізму на Беларусі, Аляксандр Лукашэнка пажадаў, каб там была і школа для выхавання вернікаў, для падрыхтоўкі святароў.

**«Я хачу, каб мы сваіх навучалі, каб у нас былі свае кадры-святары. Патрыёты, якія любяць сваю краіну і абараняюць. Няважна, мусульмане, іўдзеі, каталікі, баптысты і гэтак далей. Яны павінны быць адсюль. І карані іх павінны быць адсюль. У гэтых цэнтрах павінны быць школы. І мы гатовы падтрымліваць так, як праваслаўных, вас у гэтых школах.**

Я думаю, што ва ўсіх канфесій разумных людзей дастаткова, каб выкладаць у гэтых школах», — выказаў свае пажаданні кіраўнік дзяржавы.

Ён заўважыў, што ў рэлігійных адукацыйных цэнтрах выкладаюць разумныя, моцныя людзі. «Я ўпэўнены, што адсюль пачнецца ўмацаванне нашага грамадства. І ўсе мы зробім свой дастойны ўнёсак», — сказаў беларускі лідар.

### МУСУЛЬМАНЕ. У АДНОСІНАХ — ПОЎНАЯ ГАРМОНІЯ



**Муфтый Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі Абу-Бекір Шабановіч** адзначыў, што краіне ўдалося пазбегнуць згубнага шляху барацьбы. Ён адзначыў, што пры падтрымцы кіраўніка дзяржавы сваё развіццё ў Беларусі атрымала і мусульманства. Ён згадаў вельмі важную для беларускіх мусульман падзею — адкрыццё ў 2016 годзе аднаўленай саборнай мячэці ў Мінску. Удзел у яе адкрыцці прынялі Прэзідэнт Беларусі і Прэзідэнт Турцыі. «Гэта выклікала такі станоўчы рэзананс у свеце і ў першую чаргу ў мусульманскім свеце», — заявіў муфтый. Ён расказаў, што за мінулыя гады саборная мячэць стала цэнтрам ісламу ў Беларусі. Прычым наведваюць яе не толькі вернікі. Мячэць стала своеасаблівай дыялогавай пляцоўкай для міждзяржаўных, міжнацыянальных і міжканфесіянальных сустрэч.

# «МІР — ГЭТА ЗВЫШКАШТОЎНАСЦЬ ДЛЯ ЎСІХ НАРОДАЎ. НАМ ВАЖНА ГЭТЫ МІР ЗБЕРАГЧЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1—2-й стар.)*

Абу-Бекір Шабановіч ад усіх мусульман Беларусі падзякаваў Прэзідэнту. Ён пажадаў кіраўніку дзяржавы поспехаў у рэалізацыі ўсіх глабальных задач. «Мы ва ўсім стратэгічным і тактычным — вашы памочнікі. І выказваю веру, што ўсе мы разам пад вашым непасрэдным кіраўніцтвам захаваем нашу агульную Радзіму, любімую Беларусь», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што з мусульманамі ў яго заўжды складваліся асаблівыя адносіны — поўная гармонія. «Так склалася ў маім прэзідэнцкім жыцці, што з мусульманскімі краінамі, практычна з усімі, у мяне цудоўныя адносіны. Больш, чым цудоўныя. Я заўсёды з павагай ставіўся да іх, яны мяне нармальна ўспрымаюць, нягледзячы на тое, што я не мусульманін», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што і беларускія мусульмане ніколі не падводзілі ні ўлады, ні Прэзідэнта. «Шчыра кажучы, я ўдзячны вам за такую пазіцыю. Вы заўсёды яе займалі і ніколі не хісталіся ні налева, ні направа. Я гэта вельмі цаню. Беларусь быццам бы і не мусульманская краіна, а пазіцыя мусульман у нас сур'ёзная. Дзякуй вам вялікі за такое стаўленне да Беларусі і памятайце (гэта датычыцца ўсіх нашых канфесій), што гэта ваша зямля — і татар, і башкіраў, і іншых, якія прыехалі да нас. Не там ваша зямля. Там, можа, вашы карані, і ваша душа там, але зямля ваша тут. І я ўпэўнены, што шмат у каго і душа тут. Таму я вам вельмі ўдзячны за такую пазіцыю», — заявіў Прэзідэнт.

## БАПТЫСТЫ І СТАРАВЕРЫ. ПАЧУЦЦЁ



**Старшыня Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў у Беларусі Леанід МІХОВІЧ** звярнуў увагу, што евангельскія хрысціяне-баптысты ўжо 150 гадоў спавядаюць сваю веру на беларускай зямлі. «Сітуацыя не заўсёды была спрыяльнай для евангельскіх вернікаў, але мы рады, што нашы папярэднікі, прайшоўшы праз ганенні, захавалі веру і перадалі яе нам. І я хачу выказаць вам падзяку за тое, што з самага пачатку існавання незалежнай Беларусі мы можам свабодна пакланяцца, вызнаваць сваю веру, вучыць дзяцей, моладзь. Мы ўдзячныя за мір у краіне, за добрыя адносіны паміж рэлігіямі», — сказаў ён. Леанід Міховіч расказаў, што да іх у госці прыязджаюць аднаверцы з іншых краін. Па яго словах, яны здзіўляюцца парадку, бяспецы, умовам жыцця тут, таму што едуць з іншым уяўленнем. Ён падзякаваў за магчымасць бязвізавага ўезду для грамадзян іншых краін.

Старшыня Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў акрэсліў дзве сферы, у якіх адносіны царквы і дзяржавы перасякаюцца. Першая — гэта сям'я. «У нашых цэрквах сямейныя каштоўнасці заўсёды займалі важнае месца. І мы ўдзячныя за тое, што дзяржава клапоціцца аб сям'і, пачынаючы з самага яе зараджэння: маральная, фінансавая дапамога, вырашэнне жыллёвых пытанняў. У нас нямала шматдзетных сем'яў, і многія з іх атрымалі кватэру або пабудавалі дом дзякуючы клопату дзяржавы. Я думаю, што гэты фокус на сям'і больш чым апраўданы», — сказаў Леанід Міховіч. Другая сфера — міласэрнасць і сацыяльная работа. «Мы не застаёмся ўбаку ад сацыяльных праблем, дапамагаем інвалідам, адзінокім людзям, працуем з прыёмнымі сем'ямі. Займаемся рэабілітацыяй алкаголікаў, наркаманаў. І мы молімся за нашу краіну, за мір у краіне, за ўладу. І будзем працягваць гэта рабіць», — сказаў ён.

Прэзідэнт расказаў, што ў жыцці яму даводзілася сутыкацца з прадстаўнікамі самых розных канфесій, у тым ліку і з баптыстамі. Ён распавёў пра адзін выпадак, яшчэ з савецкіх гадоў: «На тэрыторыі нашай гаспадаркі было некалькі вёсак, практычна чыста баптысцкія. Я як сакратар парткама думаў: я туды з'езджу. Я прыехаў, пагаварыў з многімі. Добрыя такія людзі, у асноўным старэйшага ўзросту. Я прасякнуўся вельмі моцным пачуццём павагі да гэтых людзей. І як толькі пачыналі пра баптыстаў нешта казаць, я заўсёды за іх заступаўся: вы што, вось у мяне на тэрыторыі гаспадаркі ёсць гэтыя людзі, і я ў іх бываў — гэта найдабрэйшыя людзі, вельмі прыстойныя, добрыя людзі».

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што такім жа чынам складваліся яго адносіны са старaверамі. Па словах кіраўніка дзяржавы, ужо ў яго прэзідэнцкія гады яны працавалі на будаўніцтве аднаго аб'екта. «Якія гэта былі працаўнікі — цяжка сабе ўявіць. Такія працавітыя былі людзі. Яны будавалі там аб'ект адзін, і я, калі туды прыязджаю, адразу ўспамінаю старавераў, таму што такіх працавітых людзей ні да, ні пасля гэтага я больш не бачыў. І гэта стараверы пабудавалі той аб'ект, дзе адпачываюць нашы людзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што стараверы запрашалі яго ў сваю вёску. Але наведаць яе не атрымалася. А цяпер і няма той вёскі, людзі параз'язджаліся.

«У мяне з нашымі евангельскімі хрысціянамі, баптыстамі, старaверамі былі ў жыцці такія канкрэтныя выпадкі, і яны праз дзесяцігоддзі засталіся ў маім сэрцы», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

* * *

Падводзячы вынікі сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта карысная размова. Ён яшчэ раз папрасіў прадстаўнікоў розных канфесій падумаць аб стварэнні сваіх рэлігійных цэнтраў. Прычым неабавязкова, каб яны былі ў Мінску. І дзяржава, запэўніў Прэзідэнт, гатова дапамагчы ў іх стварэнні. Па яго словах, да гэтага абавязкова падключыцца і грамадства.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

# МАРШРУТАМ ПЕРАМОЖЦАЎ

## Сёлета ў праекце «Цягнік Памяці» прапрацоўваецца ўдзел прадстаўнікоў 15 народаў былога Савецкага Саюза

Аб гэтым Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА паведаміла на пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні сумеснага беларуска-расійскага патрыятычнага культурна-асветніцкага праекта «Цягнік Памяці» ў гэтым годзе.



Фота БелТА.

Ініцыятарамі ўнікальнай патрыятычнай акцыі, якая праводзіцца з 2022 года, з'яўляюцца Савет Рэспублікі і Савет Федэрацыі. З кожным годам «Цягнік Памяці» нарошчвае свой патэнцыял: за тры гады ў ім ужо прынялі ўдзел 600 хлопцаў і дзяўчат з Беларусі, Расіі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Таджыкістана і Узбекістана. Летась удзельнікі праекта наведвалі не толькі гістарычныя мясціны, дзе праходзілі ключавыя бітвы Вялікай Айчыннай вайны, але і тыя населеныя пункты, што ўвасабляюць сучасныя дасягненні нашай краіны, яе эканоміку, сацыяльную сферу.

# ЛЯСНАЯ ГАСПАДАРКА: ЁСЦЬ ФІНАНСАВЫ ВЫНІК

## Да 25 лютага ўсе буралoмы ад летняга ўрагану будуць расчышчаны

Выніковая калегія Мінлясгаса, якая прайшла днямі, сабрала кіруючы актыў галіны з усёй краіны. У мерапрыемстве ўзяў удзел намеснік прэм'ер-міністра Віктар Каранкевіч. У рамках работы калегіі ў першую чаргу былі адзначаны лясгасы і гаспадаркі, якія спрацавалі летась лепш за іншых. Да вызначэння пераможцаў рэспубліканскага спаборніцтва па выкананні паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця лясной гаспадаркі камісія падышла максімальна строга.

Па словах **міністра лясной гаспадаркі Аляксандра КУЛІКА,** у цэлым па галіне дасягнуты нядрэнны фінансавы вынік. «Тэмп росту выручкі склаў больш як 135 %. Мы выйшлі на ўзровень першага паўгоддзя 2021 года», — сказаў ён. І дадаў: «Якіх-небудзь прычын спасылацца на санкцыі цяпер быць не можа, для нас яны засталіся ў мінулым».

Акрамя таго, у 2024 годзе ўдалося знізіць фінансавую нагрузку на арганізацыі галіны. Пратэрмінаваная запазычанасць па лізінгавых плацяжах скарацілася больш як у 2,5 раза, па крэдытах — амаль у 9 разоў. У многім гэта было дасягнута і дзякуючы таму, што галіна нарасціла продаж дзелавой драўніны ў 2024 годзе амаль на 20 %. «У 2024 годзе мы рэалізавалі 10 млн куб. м дзелавой драўніны з тэмпам росту да ўзроўню 2023 года ў 119 %. Гэта сведчыць і аб развіцці сферы перапрацоўкі драўніны ўнутры краіны, у тым ліку ў арганізацыях канцэрна «Беллеспапердрапрам», — адзначыў ён.

Навучыліся зарабляць грошы. Выручка арганізацый Міністэрства лясной гаспадаркі ў 2024 годзе вырасла на трэць. У сувязі з гэтым, напрыклад, сёлета плануецца арганізаваць яшчэ дзевяць вытворчасцяў па выпуску домакамплектаў. У мінулым годзе гандлёвая сетка «Лясны домік» папоўнілася на тры гандлёвыя пункты. Сёння гэта ўжо 19 аб'ектаў, выручка па якіх павялічылася амаль у два разы, адзначыў Аляксандр Кулік. «Лідарамі продажаў па выніках 2024 года з'яўляюцца гандлёвыя пляцоўкі Клічаўскага, Гомельскага доследнага і Капыльскага доследнага лясгасаў. У мінулым годзе праз розничную сетку мы рэалізавалі грамадзянам 94 домакамплекты і 63 лазні, выробленыя па розных тэхналогіях», — расказаў ён. Сёлета, улічваючы попыт на домабудаванне, Мінлясгас плануе дадаткова арганізаваць яшчэ дзевяць вытворчасцяў па выпуску ацыліндраваных драўляных домакамплектаў.

Што датычыцца ўсёй прамысловай дзейнасці, то ў мінулым годзе ведамства выйшла на ўзровень першага паўгоддзя 2021 года, на дасанкцыйны перыяд. «Мы знайшлі альтэрнатыўныя рынкі збыту і цяпер прадаўжаем працаваць у гэтым кірунку. Цяпер ужо адгружаем пробныя партыі пелет на экспарт», — расказаў кіраўнік галіны.

Паводле слоў Аляксандра Куліка, у цэлым усе паказчыкі па галіне, якія даводзяцца дзяржавай і дзяржпраграмай «Беларускі лес», выкананы. «Але лёгкіх гадоў у нас не бывае, стыхія правярае нас на трываласць — то пажары, то буралoмы», — падкрэсліў ён.

У першую чаргу ўдалося захаваць лясы ад пажараў. «283 гектары агульнай плошчы пажараў у 2024 годзе — самая мінімальная плошча за апошнія дзесяць гадоў. Прафілактыка і зніжэнне плошчы пажараў — наша асноўная задача», — сказаў міністр.

Актыўна ў мінулым годзе працавалі і з буралoмам, асабліва на плошчах, дзе ў ліпені прайшоў ураган. «На сёння ў Гомельскай вобласці застаецца 700 гектараў, у параўнанні з пачаткам — гэта мізер. Мы выйшлі на распрацоўку 53 гектараў у суткі. Прэзідэнтам пастаўлена задача аб аператыўнай распрацоўцы, і да 25 лютага мы плануем выканаць усе работы і адпусціць людзей у месцы пастаяннай дыслакацыі. Людзі здзейснілі подзвіг — паўгода знаходзяцца там», — сказаў Аляксандр Кулік.

Стабільны стан паляўнічых рэсурсаў дае магчымасць развівацца паляўнічаму турызму, адзначыў кіраўнік Мінлясгаса. Агульныя даходы лесапаляўнічых гаспадарак склалі больш як Br11 млн, у тым ліку ад замежнага паляўнічага турызму — Br2,3 млн.

Найбольшыя даходы ад замежнага паляўнічага турызму атрымалі Навагрудскі, Магілёўскі, Быхаўскі, Івацэвіцкі, Пружанскі, Ушацкі, Рэчыцкі і Гродзенскі лясгасы.

## «МЫ БУДЗЕМ РАБІЦЬ УСЁ ДЛЯ ТАГО, КАБ ЗАХАВАЦЬ ПАМЯЦЬ»

«Сёлета мы будзем праводзіць ужо чацвёртае маладзёжнае мерапрыемства, якое добра сябе зарэкамендавала, бо гэта перш за ўсё патрыятычнае выхаванне нашай моладзі, веданне нашай сумеснай гісторыі Беларусі і Расіі, — адкрываючы пасяджэнне аргкамітэта, адзначыла Наталля Качанава. — Колькасць удзельнікаў з году ў год расце. Калі ў першы год правядзення, у 2022-м, краін-удзельніц было толькі дзве (Беларусь і Расія), то ўжо ў 2023 годзе да нас далучыліся яшчэ дзве краіны. У 2024 годзе ў праекце ўдзельнічалі хлопцы і дзяўчаты з васьмі краін».

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла: праект сапраўды ўнікальны і добра сябе зарэкамендаваў, аб чым сведчаць водгукі хлопцаў і дзяўчат, якія бралі ўдзел у ім. «У іх ёсць свой сайт, тэлеграм-канал, яны падтрымліваюць адносіны, нават нягледзячы на тое, што былі ўдзельнікамі ўжо тры гады таму, вельмі сябруюць, — канкрэтызавала спікер. — Яны добра вывучылі і ведаюць гісторыю нашых краін, гісторыю Вялікай Перамогі».

Старшыня Савета Рэспублікі расказала, што падчас сустрэчы з удзельнікамі «Цягніка Памяці» ва Уфе моладзь прапанавала праводзіць сустрэчы ўсіх удзельнікаў папярэдніх праектаў. «Сяброўства завязваецца сапраўды на ўсё жыццё, аб'ядноўвае наша славутая гісторыя, — канстатавала спікер. — І тады, калі мы бачым, як некаторыя палітыканы імкнуцца перапісаць нашу гісторыю, вядома, мы павінны зрабіць усё для таго, каб памяць, праўда аб той Вялікай Перамозе захоўвалася і перадавалася з пакалення ў пакаленне. Гэта наш абавязак перад тымі, хто загінуў. І мы будзем рабіць усё для таго, каб захаваць гэту памяць, перадаць яе тым пакаленням, якія ідуць за намі».

## «ЯНЫ ГАНАРАЦЦА ГЭТЫМ!»

Па традыцыі старт праекту будзе дадзены 22 чэрвеня ў Брэсцкай крэпасці. Фінал праекта запланаваны на 5 ліпеня. За гэты час хлопцы і дзяўчаты наведаюць 15 гарадоў: восем беларускіх і сем расійскіх.

Наталля Качанава нагадала, што падчас адной з сустрэч кіраўніка дзяржавы з удзельнікамі «Цягніка Памяці» на Кургане Славы ў Дзень Незалежнасці Прэзідэнт нашай краіны агучыў сваю мару, каб у праекце ўдзельнічалі маладыя людзі з усіх 15 краін былога Савецкага Саюза. «Мы гэта пачулі, — падкрэсліла спікер. — Пытанне прапрацоўваецца».

Каб мерапрыемства прайшло, як заўсёды, на высокім арганізацыйным узроўні, створаны арганізацыйны камітэт. Наталля Качанава выказала ўдзячнасць усім, хто пагадзіўся працаваць у аргкамітэце. Асаблівыя словы падзякі прагучалі ў адрас намеснікаў старшынь аблвыканкамаў. «Мы разумеем, што гэта наведванне гарадоў, маршрут мяняецца, таму вялікая адказнасць кладзецца на нашы рэгіёны», — патлумачыла яна і даручыла прадстаўнікам рэгіёнаў прадумаць праграмы знаходжання дзяцей на іх тэрыторыі, абмеркаваць усе тонкасці гэтага мерапрыемства: пачынаючы ад бяспекі, заканчваючы формай удзельнікаў праекта.

«Яны ганарацца гэтым! — звярнула ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі, кажучы аб значнасці праекта для моладзі. — Мы часта сустракаемся ў калектывах з маладзёжнай аўдыторыяй. І мне асабліва прыемна, калі дзеці кажуць: «Я ўдзельнік «Цягніка Памяці!» Такія мерапрыемствы вельмі важныя для нашай моладзі і даюць свой вынік. Калі будуць з'яўляцца яшчэ прапановы, аналагічныя праекту «Цягнік Памяці», вядома, гэта будзе цудоўна. Такія прапановы ўжо паступаюць».

Рэзюмуючы, Наталля Качанава падкрэсліла, што трэба зрабіць усё для таго, каб мерапрыемствы праекта «Цягнік Памяці» прайшлі без усялякіх эксцэсаў, каб яны былі запамінальнымі. «А мы, дарослыя, зробім усё, што залежыць ад кожнага з нас», — канстатавала спікер.

**Вераніка КАНЮТА.**

ВЫНІКІ І ВЫСНОВЫ

# «НА КАРЫСЦЬ УМАЦАВАННЯ СУВЕРЭНІТЭТУ, НЕЗАЛЕЖНАСЦІ І ПАСТУПАЛЬНАГА МІРАЛЮБІВАГА РАЗВІЦЦЯ»

## Ігар КАРПЕНКА — аб прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі

Прэзідэнцкая выбарчая кампанія завяршыла вялікі цыкл палітычнай мадэрнізацыі, які быў абумоўлены ўнясеннем змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Аб гэтым у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» паведаміў старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар Карпенка.

Ён нагадаў, што ў Беларусі на дзяржаўным узроўні замацавана такое паняцце, як электаральны суверэнітэт. «Гэта паняцце ўвайшло ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, якая была зацверджана Усебеларускім народным сходам, — канкрэтызаваў кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — І, вядома ж, пры ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у дзейнае выбарчае заканадаўства мы ўлічвалі тыя асноўныя кірункі, якія неабходна забяспечыць з пункту гледжання абароны нашага электаральнага суверэнітэту».

Каментуючы рэзалюцыю Еўрапарламента па прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі, прынятую яшчэ да іх правядзення, Ігар Карпенка падкрэсліў, што легітымнасць выбараў вызначаецца волевыяўленнем народа, які надзяляе легітымнымі паўнамоцтвамі канкрэтныя органы, што выбіраюцца ў выніку гэтых выбараў. «У дадзеным выпадку мы выбіралі Прэзідэнта краіны, гэта ключавая пасада ў палітычнай сістэме нашай краіны, — канкрэтызаваў ён. — Таму народ і вызначае легітымнасць таго ці іншага кандыдата, які атрымлівае большасць галасоў і адпаведныя паўнамоцтвы».

Па словах старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі, беларускі народ зрабіў свой свядомы выбар на карысць умацавання суверэнітэту, незалежнасці і паступальнага міралюбівага развіцця нашай краіны на будучыню. Аб гэтым сведчылі і міжнародныя назіральнікі, якія маглі наведаць абсалютна любы ўчастак у любым рэгіёне краіны.

«Мы не камандавалі міжнародным назіральнікам, куды і на які ўчастак ехаць, — удакладніў Ігар Карпенка. — Так, сапраўды, у нас часам пыталіся: прапануйце пэўныя ўчасткі. Мы прапаноўвалі і ў Мінску, і ў абласцях. Але разам з тым мы заўсёды падкрэслівалі, што міжнародны назіральнік можа ехаць на любы з 5325 участкаў, якія былі створаны на перыяд правядзення выбараў Прэзідэнта, што яны і рабілі».

Па яго словах, у міжнародных назіральнікаў была магчымасць размаўляць як з кіраўніцтвам, так і з членамі ўчастковых камісій, нацыянальнымі назіральнікамі. «Некаторыя размаўлялі з грамадзянамі, якія прыходзілі на выбары, — дадаў Ігар Карпенка. — Прычым размаўлялі не толькі на ўчастку, але і за яго межамі. Размаўлялі з тымі, хто праводзіў інтэрв'ю на выхадзе, так званы экзітпол. І ўсе падкрэслівалі адкрытасць і празрыстасць гэтых выбараў. Яны ацэньвалі ў першую чаргу створаныя магчымасці для таго, каб кожны грамадзянін мог прыйсці на ўчастак і свабодна ажыццявіць сваё волевыяўленне, што, увогуле, і адбывалася».

Старшыня ЦВК адзначыў, што беларускі вопыт шмат у чым цікавы замежным калегам. «Ім цікавы вопыт Беларусі, наша заканадаўства, — сказаў ён. — У рамках двухбаковых сустрэч, якіх каля двух дзясяткаў прайшло ў ЦВК, мы дамовіліся, што будзем і далей узаемадзейнічаць у пытаннях абмену думкамі па выбарчым працэсе. Будзем дзяліцца найлепшымі практыкамі электаральнага працэсу. Дамовіліся з некаторымі, што падрыхтуем адпаведныя пагадненні аб узаемадзеянні ў рамках электаральнай палітыкі, якая праводзіцца нашымі дзяржавамі. Яны ў найбліжэйшы час будуць падпісаны. Тым больш што былі запрошаны тыя дзяржавы, з якімі ў нас выбудаваны дастаткова высокі ўзровень і палітычных, і гандлёва-эканамічных адносін».

# ЯКАСЦЬ І НАДЗЕЙНАСЦЬ — НАШ БРЭНД

## Беларуская абаронка актыўна развіваецца і дэманструе рэкордныя лічбы



Днямі на базе сталічнага ААТ «Агат — сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання» прайшла выстаўка дасягненняў айчыннага ваенна-прамысловага комплексу, на якой можна было ўбачыць больш за 140 натурных узораў і макетаў найбольш сучаснай прадукцыі ваеннага і двайнога прызначэння. Непасрэдна сама дэманстрацыя была прымеркавана да пасяджэння калегіі Дзяржкамваенпрама і арганізацый, якія ўваходзяць у яго сістэму па выніках дзейнасці за 2024 год, а таксама прысвечана вызначэнню планаў і задач на 2025 год. Адразу варта адзначыць, што летась аб'ёмы прамысловай вытворчасці беларускай абаронкі дасягнулі рэкордных лічбаў.

Па словах **старшыні Дзяржкамваенпрама Дзмітрыя ПАНТУСА,** у мінулым годзе ўдалося забяспечыць рэкордны за гісторыю Дзяржкамваенпрама экспарт тавараў і паслуг, а таксама захаваць геаграфію экспарту.

— Быў узяты чарговы рэкорд за ўсю гісторыю сістэмы Дзяржкамваенпрама. Мы імпартазамясцілі дэталяў, вузлоў і работ, якія выкарыстоўваліся пры стварэнні сучасных відаў узбраення, на суму каля 147 мільёнаў долараў. І гэта за апошнія гады сур'ёзная лічба, — адзначыў старшыня Дзяржкамваенпрама.

Акрамя фінансавага боку справы, прадпрыемствамі беларускай абаронкі быў выкананы ў поўным аб'ёме Дзяржабаронзаказ-2024, а таксама актыўна выконвалася 161 доследна-канструктарская работа па распрацоўцы новых узораў. Як вынік, у 2024 годзе ва Узброеныя Сілы было пастаўлена каля 4000 адзінак новых узораў узбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі і дапаможнага абсталявання. Асвоена серыйная вытворчасць прынятых на ўзбраенне ў рамках дзяржабаронзаказу новых узораў прадукцыі. І менавіта частку гэтай сучаснай і перспектыўнай прадукцыі, якая не так даўно была пастаўлена на ўзбраенне, і можна было ўбачыць на выставачных плошчах на тэрыторыі ААТ «Агат — сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання».

У прыватнасці, тут былі прадстаўлены варыянты мадэрнізаванага ЗРК «Бук» і айчынная ракета да дадзенага комплексу, рэактыўныя сістэмы залпавага агню, абсталяваныя сучаснымі лічбавымі сістэмамі навядзення і кіравання, супрацьтанкавыя ракетныя комплексы і гранатамётны «Сапфір», сродкі агнявога паражэння і кіравання, сувязі і забеспячэння.

Асаблівая ўвага была ўдзелена беспілотнікам, бо іх шырокае выкарыстанне патрабуе адпаведна і развіцця сродкаў барацьбы з імі, як з дапамогай уздзеяння радыёэлектроннай барацьбы на каналы кіравання гэтымі беспілотнікамі, так і на іх фізічнае знішчэнне.

У гэтым кірунку дэманстраваўся баявы модуль «Сапсан» і сродак радыёэлектроннай барацьбы з беспілотнікам «Фумігатар». Акрамя ўжо звыклага набору сучаснай стралковай зброі, дэманстраваліся і сродкі індывідуальнай бронеахове. Увогуле, выстаўка чарговы раз прадэманстравала, што якасць і надзейнасць — гэта добра вядомы брэнд беларускіх збройнікаў, які дазваляе нашай краіне быць мірнай і суверэннай дзяржавай.

**Сяргей ЧЫЧЫЛАЎ.**

По решению наблюдательного совета Общества,
годовое общее собрание акционеров ОАО «Элегант»
состоится 19 марта 2025 года в 17.00 часов,
по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина 22, 2 этаж, бухгалтерия.

Повестка дня собрания:

1. О рассмотрении отчета управляющего об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2024 году и определение основных направлений деятельности Общества на 2025 год.
2. О рассмотрении аудиторского заключения, подготовленного по результатам проведения аудита годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности за 2024 год и заключения ревизионной комиссии по результатам проведения ежегодной ревизии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2024 год.
3. Об утверждении годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2024 год, годовых отчетов Общества и отчета о прибылях и убытках за 2024 финансовый год.
4. О распределении прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2024 финансовый год.
5. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
6. Об утверждении количественного состава членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Об утверждении отчета наблюдательного совета Общества за 2024 год и решениях, принятых наблюдательным советом Общества в 2024 году.

Форма проведения собрания – очная.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 17.02.2025 г.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия, ежедневно с 27.02.2025 г., с 9.00 до 16.00. Тел.: (01775) 6-80-74.

Начало регистрации 19.03.2025 года с 16 часов 00 минут до 16 часов 45 минут при предъявлении паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность; для доверенных лиц – доверенность, заверенная в установленном порядке, а также паспорт либо иной документ, удостоверяющий личность по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия.

УНН 600039318

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Клецкий райагросервис» (Продавец), проводит открытый аукцион по продаже

**здания сельского клуба с инв. № 641/С-9230 общей площадью 125,6 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622580801601000016, площадью 0,2051 га** *(право постоянного пользования),* **по адресу: Минская область, Клецкий район, Голынковский с/с, д. Звонка, ул. Школьная, д. 17.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 17 520,00** бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – **1 752,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 02.11.2023 г.

Аукцион состоится **24.02.2025 г.** в **15.00,** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **21.02.2025 г.** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320. **Тел: 8 (017) 516-80-64, 516-80-65; 8 (029) 136-31-11, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: 8 (01793) 65-194; 8 (029) 511 53 89.**

УНП 600123418

**Гомельский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды части здания железнодорожного вокзала, находящегося в собственности Республики Беларусь и хозяйственном ведении РУП «Гомельское отделение Белорусской железной дороги»**

**Дата проведения аукциона: 19 февраля 2025 г. в 10.00**
**Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артёма, 23, каб. 2-7**

| № лота | Наименование объекта аренды, цель его использования | Арендуемая площадь, (м²) |
|---|---|---|
| 1 | **Часть здания железнодорожного вокзала,** инв. № 340/С-291171, на 1-ом этаже (для организации розничной торговли) | 12,2 |

**Местонахождение объекта аренды:** Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Привокзальная.

**Начальная цена продажи права заключения договора аренды: 54,17 рублей. Задаток: 54,17 рублей.**
**Коэффициент** к базовой ставке арендной платы в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды от сдачи в аренду составляет **3,0.**
**Срок договора аренды: 3 года, начиная со дня заключения договора аренды. Шаг аукциона: 5 %.**

**Местонахождение организатора аукциона, его контакты:** г. Гомель, ул. Артёма, 23, тел.: +375 (232) 32-46-47, 32-18-95, +375 (29) 170-46-47, сайт: www.ino.by, e-mail: gomel@ino.by.

**Извещение о проведении аукциона опубликовано 07.02.2025 г. на официальных сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Гомельского областного исполнительного комитета gomel-region.by.**

УНП 401166490

# ДОБРЫ ЗАПАС

## ЗВР абнаўляюць пяцігадовы максімум

У канцы мінулага тыдня стала вядома, што золатавалютныя рэзервы зноў падраслі. За кошт чаго, пракаментавалі ў ЕАБР.



Так, у штотыднёвым аналітычным макраагллядзе ад аналітыкаў Еўразійскага банка развіцця адзначаецца, што золатавалютныя рэзервы Беларусі выраслі на 410,6 мільёна долараў за студзень 2025 года і склалі 9,333 мільярда долараў паводле стану на 1 лютага гэтага года, абнавіўшы максімум за апошнія 5 гадоў.

— Ключавым фактарам стала павелічэнне кошту золата ў структуры рэзерваў на 345,2 мільёна долараў з прычыны павышэння сусветных коштаў на 7,8 % у студзені.

# АДЛЕГЛАСЦЬ — НЕ ПЕРАШКОДА

Першая партыя з сямі новых смеццявозаў на базе шасі МАЗ перададзена ў Прымор'е.

Губернатар краю Алег Кажамяка анансаваў, што машыны будуць працаваць на смеццеперапрацоўчых прадпрыемствах ва Уладзівастоку і Арцёме.

— Мы заключылі пагадненне на пастаўку 210 новых сучасных аўтамабіляў з Беларусі. Першыя сем МАЗаў прыйшлі, у сакавіку-красавіку мы атрымаем яшчэ каля 18 машын. У красавіку прыйдзе тэхніка з паваротнай задняй воссю, якая дазволіць машынам разварочвацца (манеўрыраваць) у тых сціснутых умовах, якія ёсць у нашых гарадах, — адзначыў губернатар у сваім афіцыйным тэлеграм-канале.

# УКЛАДАННІ Ў СПРАВУ

## Рэзідэнты СЭЗ «Гроднаінвест» прыцягнулі больш за 85 мільёнаў долараў замежных інвестыцый у 2024 годзе

Летась для фінансавання інвестыцыйных праектаў рэзідэнтамі СЭЗ «Гроднаінвест» прыцягнута 86,4 мільёна долараў ЗША замежных інвестыцый, з якіх 99,8 % — прамыя замежныя інвестыцыі, паведамілі ў адміністрацыі СЭЗ.





Па структуры інвестыцый тут растлумачылі, што звыш 95 % іх аб'ёму прыпадае на Расійскую Федэрацыю (77,6 %), Польшчу (12,5 %) і Аб'яднаныя Арабскія Эміраты (5,5 %).

Асноўнымі галінамі, у якія накіроўваліся інвестыцыі, сталі хімічная прамысловасць, металаапрацоўка, вытворчасць будаўнічых матэрыялаў, дрэваапрацоўка і вытворчасць мэблі.

— Аб'ём прамых замежных інвестыцый, якія паступілі на чыстай аснове, у 2024 годзе склаў 77,1 мільёна долараў. Тэмп росту прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове склаў 102,9 %, а ў абсалютным значэнні прырост да ўзроўню 2023 года склаў 2,2 мільёна долараў, — дадалі ў СЭЗ.

Дарэчы, больш за 90 % прамых замежных інвестыцый на чыстай аснове прыцягнута рэзідэнтамі СЭЗ «Гроднаінвест», якія рэалізоўваюць інвестыцыйныя праекты ў Смаргонскім раёне, а рэзідэнты СЭЗ, размешчаныя ў горадзе Гродна і Гродзенскім раёне, прыцягнулі больш як 7 мільёнаў долараў замежных інвестыцый.

Таксама варта адзначыць, што рэзідэнтамі СЭЗ «Гроднаінвест» на працягу 2024 года забяспечана фарміраванне звыш 95 % абласнога паказчыка па прамых замежных інвестыцыях на чыстай аснове.

**У тэму**

### РЭЗІДЭНТЫ СЭЗ «ГРОДНАІНВЕСТ» СТВАРЫЛІ ЗВЫШ 300 НОВЫХ ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАЎ

За 2024 год рэзідэнтамі СЭЗ «Гроднаінвест» на дадаткова ўведзеныя працоўныя месцы прынята 308 чалавек, з якіх 148 чалавек — на прадпрыемствы Гродна. Сярэднясьпісачная колькасць работнікаў склала 18,4 тысячы чалавек. Найбольшая сярэднясьпісачная колькасць работнікаў на прадпрыемствах у Гродне (8,8 тысячы чалавек) і Смаргонскім раёне (2,1 тысячы чалавек).

Сярод галін прамысловасці найбольшая колькасць чалавек занята ў сферы вытворчасці вырабаў з дрэва і паперы (3,4 тысячы чалавек), а таксама ў лёгкай прамысловасці (3,1 тысячы чалавек).

У 2024 годзе сярэднямесячная заработная плата работнікаў прадпрыемстваў — рэзідэнтаў СЭЗ «Гроднаінвест» павялічылася на 19 %. Найбольшы прырост забяспечаны на прадпрыемствах сферы лагістыкі (69 % да ўзроўню 2023 года), будаўніцтва (29 %) і вытворчасці вылічальнай, электроннай і аптычнай апаратуры (26 %).

У разрэзе галін найбольшая сярэднямесячная заработная плата склалася ў работнікаў, занятых у сферы лагістыкі (3,4 тысячы рублёў), аграгэхнічным сектары (2,9 тысячы рублёў) і ў вытворчасці гатовых металічных вырабаў (2,7 тысячы рублёў), а па раёнах размяшчэння прадпрыемстваў — у работнікаў рэзідэнтаў СЭЗ «Гроднаінвест», размешчаных у Гродзенскім (3,5 тысячы рублёў), Свіслацкім (3,2 тысячы рублёў) і Смаргонскім (2,7 тысячы рублёў) раёнах.

# АСНОВА СТАБІЛЬНАГА РОСТУ

## Тавараабарот паміж Беларуссю і Пакістанам вырас на 4,6 %

Пра гэта заявіў па выніках пасяджэння сумеснай беларуска-пакістанскай міжурадавай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве, якая прайшла ўчора ў Мінску, яе сустаршыня, міністр энергетыкі Аляксей КУШНАРЭНКА.

У гутарцы з журналістамі ён адзначыў двухбаковы рост тавараабароту:

— За 2024 год ён вырас на 4,6 % і склаў 50,3 мільёна долараў ЗША. Дзесьці 70 % — гэта прадукцыя прадпрыемстваў прамысловасці. Таму ў рамках візіту нашых пакістанскіх калег будзе праведзены шэраг двухбаковых сустрэч.

Плануецца наведванне прадпрыемстваў прамысловасці, уключаючы МАЗ і МТЗ:

— І тут, безумоўна, мы бачым вялікі патэнцыял для нашага супрацоўніцтва. Мы таксама прапануем нашы магчымасці па пастаўках электратранспарту, электратрансфарматараў, спецыяльнай тэхнікі.

Аляксей Кушнарэнка адзначыў інтэнсіўнасць сустрэч і супрацоўніцтва, асабліва апошнім часам:

— Толькі за апошнія 6 месяцаў мы трэці раз сустракаемся са спадаром федэральным міністрам, які з'яўляецца сустаршынёй нашай міжурадавай камісіі. Паспяхова прайшоў бізнес-форум у лістападзе мінулага года ў Ісламабадзе. Мы плануем правесці аналагічнае мерапрыемства тут, у Рэспубліцы Беларусь, у рамках запланаванага візіту прэм'ер-міністра Ісламскай Рэспублікі Пакістан.

Міністр таксама расказаў аб дамоўленасці актыўна прадстаўляць магчымасці адзін аднаго ў рамках выставачных мерапрыемстваў, якія праходзяць у дзвюх краінах.

— Актыўна ўзаемадзейнічаюць стораныя рабочыя групы па розных сферах і напрамках. Усё гэта — аснова нашага паспяховага супрацоўніцтва з Пакістанам. У нас ёсць самае галоўнае — воля і жаданне развіваць двухбаковае супрацоўніцтва, — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу Джам Камаль Хан выказаў надзею на развіццё двухбаковага супрацоўніцтва па ўсіх кірунках, якія ўяўляюць узаемную цікавасць:

— Як мы абмеркавалі ў ходзе нашай сённяшняй сустрэчы з маім калегам, сустаршынёй міжурадавай камісіі — міністрам энергетыкі Рэспублікі Беларусь, уяўляецца, што на дадзеным этапе найбольш актуальным з'яўляецца ўзаемадзеянне ў наступных сектарах эканомікі: сельская гаспадарка, прамысловасць і тэхналогіі, а таксама шырокі шэраг іншых кірункаў двухбаковага ўзаемадзеяння.

Ён адзначыў, што, рэалізуючы дамоўленасці ў ходзе праведзеных у рамках візіту прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі прадукцыйных сустрэч і перагавораў, бакі ўжо прыступілі да падрыхтоўкі напярэдадні візіту ў Беларусь прэм'ер-міністра Пакістана Шахбаза Шарыфа «дарожнай карты» развіцця двухбаковага супрацоўніцтва на найбліжэйшую перспектыву, якая стане асновай для выбудоўвання ўзаемадзеяння.

ПАЕХАЛІ!

# ПА ЕЎРАПРАТАКОЛУ

## Якія змены чакаюць паслугу: аўтамабілісту на заметку

Суму шкоды, пры якой можна аформіць еўрапратакол, плануюць павялічыць. Пра гэта паведаміў начальнік Галоўнага ўпраўлення Дзяржаўтаінспекцыі Віктар РОТЧАНКАЎ.

Пры гэтым канкрэтная сума будзе «адвязана» ад замежнай валюты (вылічацца ў базавых велічынях) і значна перавышаць дзейны ліміт. Як вядома, права не выклікаць ДАІ нашы кіроўцы атрымалі ў 2010 годзе — спрошчаная схема афармлення ДТЗ аказалася выгадней усім. Кіроўцам не трэба чакаць інспектараў, якія не марнуюць часу на разбор дробных аварый, ды і пробкі, якія ўзнікаюць з-за аварый, разыходзяцца хутчэй.

Зараз максімальная сума шкоды, пры якой можна аформіць еўрапратакол, складае 800 еўра. Яна была павялічаная ў 2019 годзе, да гэтага ліміт быў удвая меншы.



**Згодна з ПДР, кіроўцы могуць не паведамляць аб ДТЗ у ДАІ пры некалькіх умовах:**

**калі шкода была нанесена толькі транспартным сродкам;**

**калі ДТЗ адбылося з удзелам двух транспартных сродкаў;**

**калі ў кіроўцаў ёсць правы адпаведнай катэгорыі і дзейная страхоўка на транспартныя сродкі;**

**калі вадзіцелі не прад'яўляюць прэтэнзій да стану адзін аднаго (алкагольнае і наркатычнае ап'яненне);**

**калі шкода, прычыненая кожнаму транспартнаму сродку, ацэньваецца кіроўцамі не больш чым у 800 еўра.**

Бланк еўрапратакола можна ўзяць у страхоўшчыка і на любой запраўцы. На адваротным баку прапісаны парадак запаўнення. А калі ўсё ж узнікнуць пытанні, можна звярнуцца ў спецыяльны цэнтр па нумары 140.

Сам бланк складаецца з двух лістоў. Запаўняць трэба толькі першы, на другім уся інфармацыя «адціскаецца». Першы ліст застаецца ў пацярпелага для падачы ў страхавую арганізацыю, другі забірае вінаўнік. Калі ўсе моманты ўзгодненыя, абодва кіроўцы падпісваюць дакумент.

Акрамя таго, Віктар Ротчанкаў заявіў, што плануецца скарэкціраваць закон у частцы прыцягнення кіроўцаў да адказнасці за няправільную перавозку дзяцей і эксплуатацыю непрыдатных шын. Гэта звязана з павелічэннем колькасці ДТЗ з удзелам дзяцей. Акрамя таго, ён не выключае і таго, што аналагічныя меры будуць прыняты і ў дачыненні да пешаходаў, якія з'яўляюцца на праезджай частцы ў нецвярозым стане.

**Сяргей КУРКАЧ.**

БУДЗЬЦЕ ПІЛЬНЫМІ!

# У ПАВУЦІННІ МАХЛЯРОЎ

## Якія ашуканскія схемы пашыраюцца ў інтэрнэце?

У час тэхналогій разам з новымі магчымасцямі ўзнікаюць і сур'ёзныя выклікі, асабліва ў галіне бяспекі. Эксперты раяць падрыхтавацца да таго, што зламыснікі будуць адаптаваць свае схемы, выкарыстоўваючы сучасныя магчымасці.

### ДЫПФЭЙКІ ЯК АСНОЎНАЯ ПАГРОЗА

Адным з ключавых фактараў, якія пагаршаюць сітуацыю, што склалася, стане актыўнае распаўсюджванне і развіццё тэхналогій штучнага інтэлекту (ШІ). Ашуканцы ўсё часцей выкарыстоўваюць яго для стварэння вельмі праўдападобных, але цалкам фальшывых малюнкаў і галасоў — так званых дыпфэйкаў. Гэтыя тэхналогіі дазваляюць генерыраваць пераканаўчыя матэрыялы, якія імітуюць галасы і знешнасць знакамітасцяў, сяброў, блізкіх, а таксама прадстаўнікоў дзяржаўных структур і банкаў.

Зламыснікі пастаянна працуюць над удасканаленнем сваіх метадаў, імкнучыся абысці сістэмы бяспекі і антыфрод-тэхналогіі банкаў. Усё часцей яны выкарыстоўваюць наступную схему: пераконваюць ахвяр зняць наяўныя і перадаць іх кур'ерам, разумеючы, што анлайн-пераводы пры праверцы спецыяльнымі структурамі могуць быць спынены банкамі. У нашай краіне «шэрыя» анлайн-пераводы досыць хутка выяўляюцца праваахоўнымі органамі.

Следчы камітэт нагадвае, што ашуканцы, расстаўляючы злачынныя «сеткі», часта выкарыстоўваюць дакладную інфармацыю і ўмела ўплятаюць яе ў павуцінне сваёй хлусні.

Кіберзлачынцы называюць дакладны адрас арганізацый, ад імя якіх яны тэлефануюць, паколькі гэтая інфармацыя знаходзіцца ў інтэрнэце ў свабодным доступе. Не дайце забліытаць, запалохаць і падмануць сябе тэлефонным аферыстам. Памятайце, што крытычнае мысленне і дасведчанасць становяцца незаменнай зброяй у барацьбе з ашуканцамі.

### СПАКУСЛІВЫЯ ПРАПАНОВЫ Ў ПАВЕДАМЛЕННЯХ

Віртуальныя зладзеі, выкарыстоўваючы чалавечую псіхалогію, актыўна прапануюць розныя выгады, зніжкі, латарэі і сертыфікаты. Іх мэта — прымусіць перайсці па спасылцы, названай у паведамленні або месенджары. Гэта могуць быць паведамленні ў сацыяльных сетках, электронныя лісты, SMS ці нават усплываючыя вокны на сайце.

Ашуканцы ўпэўненыя, што мінімізацыя кантакту дае максімальныя прыбыткі. Такая схема працуе па прынцыпе: «Менш зносін — менш рызык».

Ашуканцы імкнуцца мінімізаваць прамое ўзаемадзеянне з ахвярай, каб пазбегнуць падазронняў і пакінуць як мага менш слядоў. Асноўная задача — прывабіць на фішынгавы сайт або ў падробленыя дадатак, дзе вы, будучы ўпэўненымі ў тым, што ўдзельнічаеце ў акцыі або атрымліваеце выгаду, падасце ім доступ да сваіх асабістых даных і банкаўскіх рахункаў.



### ПЕРАДСВЯТОЧНЫЯ АТАКІ

Працэс выманьвання асабістай інфармацыі ажыццяўляецца з дапамогай розных метадаў і прыёмаў. З некаторымі з іх падзяліўся **эксперт па інтэрнэт-плацяжах Вячаслаў СЕНІН.** Напрыклад, фішынгавыя атакі. Ашуканцы ствараюць падробленыя старонкі або рассылаюць электронныя лісты з просьбай прадаставіць асабістыя даныя для абнаўлення ўліковага запісу або атрымання доступу да паслуг.

Другім спосабам стануць шкоднасныя праграмы. Зламыснікі распаўсюджваюць вірусы і іншыя шкоднасныя дадаткі праз электронную пошту, сацыяльныя сеткі або файлы, якія могуць выкрасці асабістую інфармацыю карыстальнікаў. Ашуканцы выкарыстоўваюць псіхалагічныя прыёмы, каб пераканаць карыстальнікаў даць свае даныя, прадстаўляючыся супрацоўнікамі дзяржаўных або праваахоўных органаў.

Эксперты нагадваюць, што напярэдадні будуць сітуацыйныя святы. У гэтыя моманты пільнасць грамадзян ніжэй, чым у іншыя дні, а значыць, што ашуканцы пачнуць атакаваць мацней і напорыста. Можна не звярнуць увагі на фішынгавыя сайты з купляй падарункаў на 14 лютага ці 8 Сакавіка. І па няўважлівасці здзейсніць небяспечныя плацяжы.

Важна памятаць некалькі стандартных правілаў. Купляць толькі на правераных сайтах, правяраць уважліва URL рэсурса (назва яго ў радку пошуку). Нават адна адрозная літара будзе мець значэнне. Асабліва трэба быць уважлівым пры пераходзе па рэкламных паведамленнях аб вялікіх распродажах і зніжках.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ПЕРАД ВЯЛІКІМ СТАРТАМ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Школьнікаў, а зарэгістраваліся на рэпетыцыю ЦЭ 56 386 чалавек, прынялі 144 пункты здачы РЦЭ. Навучэнцы, як і раней, маглі выбраць любы вучэбны прадмет, уключаючы рускую і беларускую мовы. Дарэчы, самым папулярным прадметам і стала руская мова, якую выбралі 16 721 чалавек, а гэта — 29,7 % ад колькасці зарэгістраваных. Другі па папулярнасці выбар — матэматыка, здаваць якую выказалі жаданне 12 900 чалавек, або 22,9 %.

Дастаўлялі навучэнцаў да месца правядзення РЦЭ цэнтралізавана ў суправаджэнні педагогаў. У сельскай мясцовасці для гэтага падалі школьныя аўтобусы. Іх, дарэчы, было задзейнічана каля 800 адзінак. Што датычыцца пунктаў правядзення рэпетыцыйнага ЦЭ, то тут былі створаны камфортныя і бяспечныя ўмовы знаходжання, каб дзеці змаглі цалкам засяродзіцца на выпрабаванні. Больш за тое, было арганізавана ўзаемадзеянне з тэрытарыяльнымі органамі ўнутраных спраў, упраўленнямі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У пунктах правядзення былі створаны пасты медыцынскай дапамогі і іншыя ўмовы, напрыклад для захоўвання асабістых рэчаў удзельнікаў РЦЭ, знаходжання ўдзельнікаў рэпетыцыі, якія завяршылі выкананне экзаменацыйнай работы раней устаноўленага тэрміну, а таксама суправаджаючых дзяцей педагагічных работнікаў.

**На рэпетыцыйнае выпрабаванне з сабой трэба было ўзяць пашпарт або іншыя дакументы, якія сведчаць асобу: ID-карта, даведка, якая пацвярджае страту дакумента, пасведчанне бежанца, від на жыхарства. Таксама неабходна было мець пропуск, чорную гелевую або капілярную ручку, а тым, хто здае хімію або фізіку, можна было мець пры сабе самы просты калькулятар. Астатнія прадметы пранесці не дазвалялі, нават ваду. Аднак пітны рэжым быў арганізаваны на месцы.**

У Міністэрстве адукацыі падкрэслілі, што ў гэтым годзе нейкіх радыкальных змяненняў у правядзенні і РЦЭ, і самога ЦЭ не прадбачыцца. Адзінае — унесена забарона на выкарыстанне мабільных тэлефонаў і сродкаў аўдыя-, відэа- і фотафіксацыі не толькі ў аўдыторыях, дзе праводзіцца ЦЭ, але і ў пункце правядзення ЦЭ ў цэлым.

Галоўнай мэтай гэтага выпрабавання **міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Андрэй ІВАНЕЦ** назваў магчымасць для выпускнікоў школ адаптавацца, адчуць сітуацыю, паўдзельнічаць у выкананні арганізацыйных момантаў, каб пры здачы цэнтралізаванага экзамену пазбегнуць лішніх хваляванняў або, таго горш, стрэсу. Кіраўнік ведамства расказаў: «Рэпетыцыю цэнтралізаванага экзамену мы праводзім трэці год запар. Сёлета хацеў бы адзначыць вельмі высокую яўку дзяцей. З больш чым 56 тысяч удзельнікаў на рэпетыцыю з'явіліся 55 485 чалавек, гэта 98,4 %».

Па словах кіраўніка ведамства, абсалютна ўсе адсутныя, а гэта 908 чалавек, не з'явіліся па ўважлівай прычыне. Крыху больш за 700 школьнікаў захварэлі. Іншыя прычыны таксама ўважлівыя — удзел у спаборніцтве альбо праходжанне аздараўленчай кампаніі.

— У кожным пункце правядзення РЦЭ была арганізавана работа медыцынскіх брыгад, — канстатаваў Андрэй Іванец. — Па стане здароўя прайсці выпрабаванне не змог адзін навучэнец у Гомельскай вобласці.

Міністр нагадаў, што патрабаванні да правядзення рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену ідэнтычныя патрабаванням да правядзення самога ЦЭ.

— Гэта такі ж строгі кантроль наяўнасці дакумента, які сведчыць асобу, прыбыццё ў пункт правядзення цэнтралізаванага экзамену за 30 хвілін, каб стварыць максімальна камфортныя ўмовы, гэта лёсаванне дзяцей для размеркавання па аўдыторыях, — сказаў ён. — Пры гэтым мы цалкам захавалі празрыстасць: кожны абітурыент, які прайшоў рэпетыцыю цэнтралізаванага экзамену, у сваім электронным кабінеце на сайце РІКВ зможа ўбачыць копію сваёй работы і азнаёміцца з вынікамі экзамену. Табліцы адпаведнасці першасных і тэставых балаў па ўсіх прадметах размешчаны на сайтах Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў і адукацыйнага ведамства. Там жа прадстаўлены шкалы пераводу балаў, атрыманых удзельнікамі па стабальнай шкале, у адзнаку па дзесяцібальнай. Агучыў кіраўнік міністэрства і тэрміны, калі будуць вядомыя вынікі РЦЭ, — не пазней за 28 лютага.

— Плануецца, што праверка пройдзе на працягу 20 дзён, — сказаў ён. — Школьнікі павінны разумець, што дастаткова сур'ёзная ўвага ўдзяляецца якасці праверкі, каб кожны быў упэўнены ў выніковасці яго правядзення.

Міністр таксама дадаў, што перздачы рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену няма.

**Для школьнікаў рэпетыцыйны экзамен стаў выпрабаваннем не толькі на веды, але і на сумленне. Некаторыя навучэнцы гэта выпрабаванне, на жаль, не прайшлі.**

**За рознага роду парушэнні з рэпетыцыі былі выдалены пяць чалавек: у кагосьці быў выяўлены пры сабе смарт-гадзіннік, што забаронена, хтосьці спісаў «падказкамі» руку, а адзін школьнік і зусім трапіўся са шпаргалкай. І ў гэтай сувязі Андрэй Іванец яшчэ раз папярэдзіў: «Выкарыстанне забароненых для праносу сродкаў будзе сур'ёзна адсочвацца, да парушальнікаў будуць прымяняцца адпаведныя меры — выдаленне з экзамену».**

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

ДОБРАЯ НАВІНА

# НАДЗЕЙНЫ ТЫЛ

## Яшчэ некалькі сем'яў ваеннаслужачых Магілёўскага гарнізона атрымалі ключы ад арэндных кватэр

У Магілёўскай вобласці чарговае наваселле. У канцы студзеня радасная падзея адбылася ў Асіповічах — учора, 10 лютага, віншавальныя словы гучалі ў адрас васьмі сямей ваеннаслужачых, якія прапісаліся ў Магілёве ў новым доме па вуліцы Жамчужнай.



Мікраараён Саломенка-2 уражвае размахам будаўніцтва. Тут хутка растуць новабудоўлі, побач з імі добраўпарадкоўваюцца камфортныя дзіцячыя пляцоўкі, будуюцца сацыяльныя аб'екты. Васьміпавярховік, дзе будуць жыць сем'і вайскоўцаў, яшчэ і новага пакалення — электрычны.

Гжэгаж Барташэвіч родам з Гродзеншчыны, цяпер ён магіляўчанін. Разам з жонкай Ганнай і паўтарагадовай дачкой Міраславай атрымаў трохпакаёўку ў новым доме. Цяпер праходзіць службу на ваеннай кафедры Беларуска-Расійскага ўніверсітэта ў якасці старшага выкладчыка. На чарзе па паляпшэнні жыллёвых умоў стаяў з 2017 года, але ў верасні мінулага года ў сувязі з павышэннем пераехаў у Магілёў і вось ужо трымае ў руках ключы ад трохпакаёвай кватэры.

— Раён падабаецца, я бачыў план яго перспектыўнай забудовы. І наогул Магілёў мне вельмі імпануе, — усміхаецца Гжэгаж.

Маладая сям'я Мікалая і Аліны Філіпенкаў з маленькім сынам Аляксандрам таксама атрымала трохпакаёўку. Мікалай — старшы тэхнік роты воінскай часці 72471, што ў Пашкаве. Служыць там ужо пяць гадоў. Кватэру ідуць глядзець разам журналістам «Звязды» — Мікалай з Алінай у ёй яшчэ ні разу не былі. Па тварах відаць, што новае жыллё падабаецца. Прасторныя пакоі, дзве лоджыі. Гатоўнасць кватэры — заязджай і жыві. І шпалеры прыемнага колеру, і ламінат у тон.

— Што казаць — шыкоўна! — радуецца Мікалай. — Пачуцці перапаўняюць, не чакалі, што кватэра такая вялікая.

Родам сужэнцы з Быхаўскага раёна. Мяркуюць, што да канца месяца заселяцца. Аліна радуецца, што ёсць асобны пакой для дзіцяці.

— Вельмі прыемна, што дзяржава клапоціцца пра нас, — дзеляцца маладыя людзі. — Будзем працаваць на карысць радзімы, выхоўваць новае пакаленне. Спадзяёмся, што наш Аляксандр таксама пойдзе па ваеннай сцяжынцы.

**Ваенны камісар Магілёўскай вобласці Віталь ЯДЗЕВІЧ** лічыць, што атрыманне ключоў ад жылля — вельмі важная для ваеннаслужачых падзея.

— Адсутнасць жыллёвых праблем дае ўпэўненасць і стымул для нясення службы па абароне краіны, — падкрэсліў ён. — Праграма па забеспячэнні ваеннаслужачых арэндным жыллём будзе працягвацца, і наперадзе яшчэ не адно наваселле. Летась іх, дарэчы, было 60. У Магілёўскім гарнізоне тых, хто мае патрэбу ў жыллі, засталося менш за 30 чалавек.

— Мы забяспечваем арэнднымі кватэрамі не толькі моладзь, — удакладніў суразмоўнік. — Тыя, у каго кватэрнае пытанне стаіць больш востра, у ліку першых. Жыллё і добры сацыяльны пакет — стымул служыць у войску, а таксама добрая магчымасць замацаваць ваеннаслужачага ў тым гарнізоне, дзе ён служыць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

# ПА КРАІНЕ — ЗА ЎРАЖАННЯМІ

## ВЫРАШАЮЦЬ КАДРЫ

Сёлетні конкурс стартаваў з лютага, прыём заявак працягнецца да 30 верасня. Прадугледжана 14 намінацый: «Я спазнаю Беларусь», «Экскурсавод года», «Турыстычная кампанія года», «Сродак размяшчэння года», «Санаторый года», «Аграэкасядзіба года», «Матэрыял года», «Музей года», «Фатаграфія года», «Аб'ект экалагічнага турызму года», «Аб'ект прамысловага турызму года», «Аб'ект рэлігійнага турызму года», «Падзейнае мерапрыемства года», «Аб'ект дзелавога турызму года». Арганізатарамі выступаюць Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнае агенцтва па турызме.

Самай народнай намінацыяй стала «Я спазнаю Беларусь» — летась было пададзена больш за 400 заявак ад беларусаў, якія падарожнічаюць па розных кутках.

— Мы рэкамендуем на сайце агенцтва месцы, цікавыя для наведвання. Гэта сотні аб'ектаў па ўсіх рэгіёнах нашай краіны. Запрашаем падарожнікаў заехаць туды ў бягучым годзе, сфатаграфавацца, папоўніць сваю калекцыю новымі здымкамі, потым даслаць нам разам з заяўкай на конкурс і атрымаць дастойную ўзнагароду, калі колькасць наведаных аб'ектаў будзе большая, чым у іншых. У гэтай намінацыі могуць узяць удзел і дзеці. Мы вельмі рады юным удзельнікам конкурсу. Гэта заўсёды выклікае станоўчыя эмоцыі, — адзначыў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ.**

**Ёсць і намінацыі, дзе ўдзельнічаюць прафесіяналы. Напрыклад, у намінацыі «Фатаграфія года» часцей за ўсё бяруць удзел прафесійныя фатографы, але і шмат аматараў. Аднак тут ужо ацэньваецца не колькасць, а якасць, аўтарская задума. Менавіта гэта намінацыя ў мінулым годзе карысталася найбольшай папулярнасцю — было пададзена амаль 500 заявак. Шмат удзельнікаў і па намінацыі «Падзейнае мерапрыемства года». Ва ўсіх рэгіёнах краіны праходзіць шмат цікавых мерапрыемстваў і арганізатарам прапануюць такую магчымасць.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)





## РАСІЯНЕ ЕДУЦЬ У БЕЛАРУСКУЮ ГЛЫБІНКУ

Акрамя таго, у конкурсе могуць удзельнічаць экскурсаводы, турыстычныя кампаніі, тыя, хто непасрэдна сустракае гасцей, фарміруе экскурсіі, туры. Ёсць асобная намінацыя для атэляў, прычым розных катэгорый — ад больш бюджэтных да прэміум-класа. Асобную намінацыю мае і брэнд нашай краіны — санаторыі. Адной з найбольш папулярных намінацый традыцыйна з'яўляецца «Аграэкасядзіба года». Ёсць і намінацыя для музеяў розных катэгорый.

У 2023-м была ўведзена намінацыя «Аб'ект рэлігійнага турызму года». Яна замацавалася і стала традыцыйнай. А ў Год добраўпарадкавання ў кожнай намінацыі ўведзены крытэрыі, звязаныя з тым, як аб'екты праводзяць добраўпарадкаванне тэрыторыі побач з сабой. Гэта адносіцца і да музеяў, і да санаторыяў, і да гасцінічных комплексаў, і да аб'ектаў экалагічнага турызму.



**Конкурс «Пазнай Беларусь» садзейнічае не толькі ўнутранаму турызму — па-новаму для сябе адкрываюць нашу краіну і замежныя госці. Напрыклад, як адзначыла дырэктар турыстычнай фірмы «Ілва», лаўрэат XXII Рэспубліканскага турыстычнага конкурсу «Пазнай Беларусь» у намінацыі «Турыстычная кампанія года» Ларыса Пятроўская, расійскія турысты вельмі любяць беларускую глыбінку і з задавальненнем едуць у малыя гарады. Дырэктар дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Бярэзінскі біясферны запаведнік» Андрэй Пракошын дадаў, што летась запаведнік наведала больш за 100 тысяч гасцей, у тым ліку з іншых краін. Пераважна прыязджаюць найбліжэйшыя суседзі — расіяне, шмат было гасцей з краін Балтыі, наведвалі турысты з Амерыкі, а ў мінулым годзе — нават з Аўстраліі.**

### У тэму

**Больш за 15 тысяч замежнікаў на бязвізе**

Паводле паведамлення Дзяржпагранкамітэта, з 1 студзеня ў Беларусь прыбылі 15 238 іншаземцаў з 38 краін, уключаных у спіс «бязвізу». Большасць падарожнікаў прыехала з краін-суседзяў — Літвы, Латвіі і Польшчы. Усяго ж з 15 красавіка 2022 года нашу краіну наведалі 1 046 973 жыхары Еўропы. З Латвіі прыбылі 329 510 замежнікаў, з Літвы — 594 815, з Польшчы — 105 555.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ИНФОРМАЦИЯ о проведении повторных аукционных торгов по продаже не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и земельного участка в частную собственность в г. Жлобине

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов | **Аукцион состоится 11 марта 2025 г. в 11-00** часов по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1)<br>Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | | |
| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| Наименование объекта/адрес земельного участка | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Виноградная, 46 и земельный участок в частную собственность | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Радужная, 24 и земельный участок в частную собственность | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Малиновая, 13 и земельный участок в частную собственность | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом, расположенный по адресу: Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, пер. Свободы 2-й, 7 ( с готовностью 12 %) и земельный участок в частную собственность |
| Кадастровый номер участка | 321850100001009737 | 321850100001009738 | 321850100001009732 | 321850100003002504 |
| Площадь, га | 0,1214 | 0,1004 | 0,1 | 0,0832 |
| Целевое назначение | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)) |
— Людзі вучыліся ў спецыяльных землямерскіх школах не проста каб умець вымяраць, а каб умець намаляваць гэты план. Планы аздабляліся і постацямі людзей, мог і землямер сябе намаляваць. Напрыклад, вядомы картограф Юзэф Маркевіч, які працаваў у Гродне ў часы Антонія Тызенгаўза, пасля таго як у 1783 годзе склаў план, дзе перапісаны ўсе жыхары горада з участкамі зямлі, а іх было звыш 800, намаляваў на карце землямера і напісаў па-латыні «салодкі адпачынак стомленым» — што азначае, што выканана вялікая праца, — расказаў цікавы факт **загадчык аддзела навейшай гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея Андрэй ВАШКЕВІЧ**. — Дарэчы, сам план захоўваецца ў Маскве, але ў нас знаходзіцца якасная копія.

Некалькі копій прадастаўлены замежнымі архівамі. Так, стакгольмскі архіў даслаў план Гродна, які складзены шведскімі картографамі ў 1706 годзе і адлюстроўвае ваенную базу расійскіх войскаў падчас Паўночнай вайны. Гэта самы стары дакумент такога роду, які захаваўся.

На так званай Дрэздэнскай карце Гродна 1753 года цёмнымі плямамі паказаны часткі горада, знішчаныя чарговымі пажарамі. На адноўленым музейнымі рэстаўратарамі плане 1882 года можна ўбачыць першы генеральны план будучай забудовы горада Гродна. Але ён так і не быў рэалізаваны з-за страшэннага пажару 1885 года.

У музеі ганарацца арыгінальнымі экспанатамі. На выстаўцы гэта план 1793 года з подпісам караля аб выдзяленні ўчастка гараджаніну. Нават звычайны чалавек можа заўважыць, як мянялася аблічча горада на працягу стагоддзяў, як сярэднявечча ўступала месца буржуазнаму ўкладу: расло насельніцтва, будаваліся прадпрыемствы.

— На картах Гродна нагадвае сэрца, і яно пастаянна расло, з'яўляліся новыя артэрыі — кварталы, вуліцы. І па картах відаць, чым гэта было прадыктавана. Напрыклад, з'яўленнем чыгункі, вакзала, вайсковых частак, мануфактур. Можна прасачыць, як мяняліся назвы вуліц. Згодна з картамі, сучасная вуліца Карла Маркса ў часы ВКЛ называлася Азёрская, Скідзельская, Брыгіцкая, у часы Расійскай імперыі — Купецкая, Кутузаўская. Падчас фашысцкай акупацыі была іншая назва, — уводзіць у гістарычны экскурс суразмоўнік.

Гісторык між тым звяртае ўвагу на самы позні выставачны экзэмпляр — арыгінальны нямецкі план 1940 года. Ён складаўся, калі Германія рыхтавалася да нападу на Савецкі Саюз. На ім назвы ўстаноў ужо напісаны па-нямецку. Гэтым планам скарысталіся і гродзенскія падпольшчыкі падчас акупацыі: імі на план нумарамі нанесены аб'екты, дзе фашысты размяшчалі свае войскі. «Гэта каштоўны для музея экспанат, на ім ёсць подпіс партызанскага камандзіра. Магчыма, план трапіў да партызан у выніку ваеннай аперацыі», — зазначае суразмоўнік. На выстаўцы таксама ёсць падборка фотаздымкаў акупаванага фашыстамі Гродна.

А вось правобразам сучаснага генеральнага плана Гродна можна лічыць план «Аўгусцінка», які быў створаны ў 1931 годзе. Ён з'яўляўся першым дакладным планам горада, дзе ўлічваліся перапады вышыні, і складаўся ў сувязі з пракладваннем у горадзе водаправода і каналізацыі — без такіх замераў правесці камунікацыі было немагчыма. Гэты план узялі за аснову ў пасляваенны час, калі горад адбудоўваўся пасля ваеннага разбурэння. «Менавіта на аснове картаў і планаў можна прасачыць жывы пульс горада, які пераходзіў з адной эпохі ў другую на працягу амаль трох стагоддзяў», — заўважае гісторык.

На яго думку, было б вельмі добра, каб у Гродна па прыкладзе Мінска і Брэста з'явілася выданне, дзе горад быў бы прадстаўлены на старых картах і планах. Паколькі матэрыялу для такога зборніка хапае, а ведаць мінулае і важна, і цікава.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении электронных торгов**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко 43. |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование лота | Начальная цена лота, с НДС 20 %, руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227728, общая площадь – 13,7 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-26 | 21 360,00 |
| 2 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227729, общая площадь – 13,6 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-27 | 21 360,00 |
| 3 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227730, общая площадь – 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-35 | 21 360,00 |
| 4 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227731, общая площадь – 13,5 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-36 | 21 360,00 |
| 5 | Машино-место с инвентарным номером 500/D-7988227732, общая площадь – 13,3 кв. м, адрес – г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1-37 | 21 360,00 |

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона.

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов.

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 5 (пять) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 14.03.2025 г. с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 13.03.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 317-95-42.**
**Email: auction@cpo.by**

ПРОСТАЯ МОВА

# «...І НЕ АДГЭТУЛЬ МЫ СЫХОДЗІМ,
## а ў час вяртаемся туды»



Кар'ер, паводле слоўніка, ёсць месца здабычы карысных выкапняў, гліны, пяску... Але ж гэта — па-другое, а па-першае, бег каня, прычым — наўскач, найхутчэйшы...

Такім чынам з месца ў кар'ер.

Горад, вечар, аўтобус — можна сказаць, пусты, але ж варта было зайсці, падняцца ў салон, як побач падхапіўся мужчынка, сказаў:

— Сядайце.

Дзякую. Саджуся і — выдаткі прафесіі — крадком пазіраю ў бок джэнтльмена: спрабую вызначыць «матывы ўчынку». Гэта значыць, ён адчувае мужчынам сябе? Жанчынай мяне, ці...

Анекдот. Той жа аўтобус і тыя ж двое. Ён уступае месца. Яна (манерна): «О, дзякуй-дзякуй! З вашага боку гэта настолькі велікадушна!» — «Вось гэта? Якраз такі не, — хмыкае спадарожнік. — Гэта, каб вы, бабы, меней трындзелі, што мы, мужчыны, бачым толькі прыгожых».

Даруем «герою» яго камплімент; прызнаем, што «не трындзець» з нагоды і без нам сапраўды цяжка, а таму...

### УБАЧЦЕ РОЗНІЦУ

Вечар. Тэатр, які пачынаецца з вешалкі. На ёй у гардэробе мы пакідаем сваю вопратку, пазіраем у блізкае люстэрка і...

Можна сказаць, вачыма Анатоля Яфрэмавіча, які прыйшоў сустракаць Новы год да Людмілы Пракопаўны (Эльдар Разанаў «Службовы раман»), бачым Алісу Фрэйндліх, дакладней — яе гераіню, якая папраўляе на сабе адразу... усё: прычоску, макіяж, акуляры, трохі цесную ці проста даўно неназдяваную сукенку, пацеркі...

Яе спадарожнік (як, дарэчы, і абсалютная большасць мужчын), глянуўшы ў тое ж велізарнае люстэрка, не папраўляе на сабе нічога: ён адбіткам цалкам задаволены.

### ЧАС ЦУДАЎ

Пятровіча хлебам не кармі, дай што-небудзь змарозіць!

Днямі і ўжо цямком ён з вёскі прыехаў, ад цешчы гасцінцаў навёз. Ля пад'езда «распалавініў»: нешта забраў з багажніка, занёс у кватэру, нешта (рук не хапіла ды і стаміўшыся...) пакінуў у машыне — назаўтра забраў.

З пакункамі — прычым досыць цяжкімі — зайшоў у пад'езд: толькі данёс да ліфта, суседка адтуль.

— Вы што, — здзівілася, згледзеўшы сумкі, — ужо ў краму схадзілі?!

Пятровіч, вокам не міргнуўшы:

— Дык ёсць жа сэнс! У нашай цяпер — новая акцыя: хто першы прыйдзе, задарма ўсё бярэ. Я во, бачыце...

Не паспеў пахваліцца: ліфт зачыніўся — павёз яго ўверх.

Суседка пехам пайшла — з пад'езда на вуліцу. А ўжо там куды?..

Ну хто ж гэта ведае?

Магчыма, у той магазін, каб распытаць пра акцыю. Іх жа шмат цяпер. Дык мо ёсць і такая: першаму — задарма?

### КОЛА

Нехта мудра заўважыў, што жыццё — як універмаг, дзе можна знайсці ўсё, апроч таго, што напраўду трэба.

Але ж мы пакуль не трацім надзеі: сярод працэнтаў самых розных мужчынскіх маек спрабуем знайсці найлепшую.

Іншыя пакупніЦЫ (у велічэзным аддзеле хоць бы адзін мужчына!), здаецца, таксама.

— Вось вы б якую ўзялі? — паклаўшы на кранштэйн пяць штук 60-га (?!) памеру, пытае маленькая жанчынка гадоў 40.

З пяці — выбіраць (да таго ж для незнаёмца) куды прасцей! А што складаней, дык гэта ўстрымацца і не спытаць, каму ж, якому волату ці волатАМ, кабета рыхтуе абноўкі?

— Ды сыну з мужам. Яны ў мяне абодва носяць балахоны, любяць усё свабоднае.

Любоў дыктуе моду. Ці мода — любоў?

### ВОЖЫК — ЁН ЗРАЗУМЕЎ БЫ...

Пытанне «на засыпку»: хто ведае, колькі каньяку трэба дадаць у каву, каб раніца была добрай?

Зрэшты, гэта — колькі ні дадай — спосаб дарагаваты: тую ж раніцу можна палепшыць танней — кароценькім школьным сачыненнем. Даслоўна: *«Жыл был йожык. Он любил павеселица, пакачаца, паваляца на траве. Всё лета он висилился, качался, валялся. Наступила осень. Он залес ф сваё дупло, лёх и сдох. Вот и всё!»*

А шкада!

Прыяцелька расказвала, як калісьці, яшчэ студэнтамі, яны ездзілі на цаліну, як працавалі там пад кіраўніцтвам аксакала Мурада Мурадавіча, як той успамінаў Маскву: сваю вучобу на курсах, прагулянкі па вуліцах, паездкі ў метро...

Падчас самай першай заўважыў, што ўсе чытаюць.

Ён таксама ўмеў — купіў сабе кніжку. З ёй назаўтра ж зайшоў у вагон, сеў, не гледзячы разгарнуў, падняў галаву, каб пафарсіць, што ён — як усе.

*— Дедушка, вы вверх ногами книжку держите,* — заўважыла нейчае дзіця.

Дзед — хутчэй па вачах ды рухах — зразумеў, пра што гэта, і паправіўся — кніжку перакруціў.

А вось дзе ў яе ногі, сцяміць не мог! Гэта «йожыку» было б зразумела. Калі б не восень, не «дупло». І не «лёх».

### МОЖНА ГЭТАК... МОЖНА ТАК?

У Анюты дзве кватэры. У адной — яны з дачушкай жывуць, другую здаюць кватарантам — на год, на два, па дамове. Усё ж капейка, хоць часам, як кажа гаспадыня, яе і не хацелася б, бо адна з кватарантак мела моду па начах на галаве хадзіць, розныя гулянкі ладзіць, другая забылася выключыць пліту — з усімі адсюль наступствамі...

За новую кватарантку сваякі паручыліся: маўляў, надзейны чалавек — праблем ніякіх не будзе, прынамсі, у гаспадыні.

...Праблемы, як аказалася, у самой кватарантки: з мужам яны ў разводзе. Сынка гадуюць, можна сказаць, па чарзе: тыдзень малы жыве з мамай, тыдзень — з бацькам. Усё па справядлівасці, усім добра.

Ці ўсё ж...

### ЛЕПШАЕ — ВОРАГ ДОБРАГА

Вечар. Дом. Кухня. Посуд — шум вады з-пад крана і нейкі яшчэ? Ды ціха, настойлівы? Але ж гэта не мабільнік?! Не дамафон? Не таймер? Не ў суседкі справа?

Гэта — нарэшце дайшло — тэлефон, хатні, правадны. Ён столькі месяцаў маўчаў, што нават «голас» яго забыўся! А некалі ж... І зусім, здаецца, нядаўна?!

З людзьмі таксама бывае: здаюцца такімі патрэбнымі, блізкімі, нават незаменнымі! А потым з'яўляюцца новыя і...

Як ёсць, так ёсць.

### «І НЕ АДГЭТУЛЬ МЫ СЫХОДЗІМ...»

На той час сям'я ў Пятроўны была вялікай: муж, двое дзяцей, чатыры сястры з мужамі, восем пляменнікаў-пляменніц...

Яны любілі збірацца разам. Дамаўляліся, прычым загадзя, на чыёй «тэрыторыі», хто што згатуе-спячэ, прыбіраліся самі і прыбіралі дзяцей (там жа мяняліся іхнімі рэчамі), цуд, як добра сядзелі! Вясёлыя, галасістыя ўсе — па маладосці любілі пасмяяцца-паспяваць. Ды і патанчыць былі б не супраць, калі б месца было. «Вось дабудуем Лідзіну дачу», — марылі ўсе. І такі ж бударвалі!

Цуд, які атрымаўся дамок: з дубовымі падрубамі, з вялікімі вокнамі, з гаражом і падвалам, з прасторнай гасцёўняй, з дзвюма спальнямі на першым паверсе і дзвюма на другім... Толькі жывы, як здавалася, толькі прымай гасцей!

Вось гэтага, на жаль, гаспадыня і не паспела: сэрца падвяло.

Гаспадар (дзеці паразляталіся) гадоў колькі яшчэ паездзіў, папрацаваў (пераважна адзін) і таксама здаўся: не тыя гады, не тое здароўе.

Думаў выставіць «аб'ект» на продаж і не змог, бо столькі ўкладзена працы і столькі душы...

Пустуе дамок.

Летась, у лістападзе (па дарозе было), заязджалі «праведаць» і найперш — як ні дзіўна — убачылі не яго, а... траву — аж чырвона-жоўтую ад яблыкаў-ападкаў.

Назбіралі найлепшых, паклалі на стол, паселі па баках на знаёмых лавачках — пачаставаліся, пашкадавалі, што няма гаспадыні, якая нам рада была — некалі раней...

— І цяпер, — зляцеўшы на зямлю, «сказаў» апошні яблык. І тым самым нагадаў такое аптымістычнае:

*А раптам*
*створана ў прыродзе*
*Усё на іншыя лады*
*І не адгэтуль мы сыходзім,*
*А ў час вяртаемся туды.*

**Валянціна ДОЎНАР.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
### по объекту «Возведение жилой застройки по ул. Мястровская в м-не Лебяжий, г. Минск»

**Застройщик:** Общество с ограниченной ответственностью «СМУ-87» зарегистрировано Минским горисполкомом 15.02.2023 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 193672656.

Местонахождение: Республика Беларусь, 220069, г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1510, тел. 375 (44) 711-33-00.

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник—пятница, с 9.00 до 19.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Ранее реализованные проекты**: нет

**Информация о проекте строительства:**

**Цель строительства** – строительство «Возведение жилой застройки по ул. Мястровская в м-не Лебяжий, г. Минск».

Начало строительства – 27.05.2024 г., предполагаемый срок ввода в эксплуатацию – 13.11.2026 г.

**Застройщиком получены:**

- решение Минского городского исполнительного комитета №4591 от 10.11.2023 г. о предоставлении земельного участка и разрешении строительства;

- свидетельство (удостоверения) о государственной регистрации земельного участка и возникновении права на него № 500/1829-9966;

- заключение государственной экспертизы № 232-15/24 от 20.05.2024 г. (положительное);

- извещение о получении уведомления о производстве строительно-монтажных работ и регистрации объекта строительства органами государственного строительного надзора от 27.05.2024 г. № 2-209Ж-018/24;

- договор строительного подряда от 24.05.2024 г. № 24/05-24;

**Информация об объекте:**

Объект строительства расположен в г. Минске по ул. Мястровская в м-не Лебяжий.

Проектом предусматривается строительство трехсекционного жилого дома, 12-16-25 этажей на 422 квартиры, со встроенными помещениями общественного назначения на первом этаже и пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой на 68 машино-мест. В доме запроектированы 1-, 2-комнатные квартиры, квартиры-студии.

Наружные стены здания – из монолитного железобетона с утеплением из минераловатных плит, блоков ячеистого бетона, керамических блоков. Окна жилой части – профиль ПВХ с заполнением двухкамерными стеклопакетами, оснащены детскими замками безопасности и вентиляционными клапанами. Элементы остекления лоджий – профиль с заполнением стекла. Наружная отделка стен здания – штукатурка, покраска фасадными красками, часть стен первого этажа – вентилируемый фасад с отделкой из плит керамогранитных. В каждой секции предусмотрено 2–4 лифта.

Внутренняя отделка квартир предусматривает штукатурку стен и перегородок, потолки без отделки, полы – основание под устройство верхнего покрытия, розетка для электроплиты, установка унитаза в с/у.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности после ввода в эксплуатацию жилого дома и передачи дольщикам объектов долевого строительства, входят: помещения инженерного назначения; межквартирные тамбуры, лестничные клетки, лифтовые холлы, вестибюли, колясочные, кладовая уборочного инвентаря, лифты, конструкции дома, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, элементы внутридомовой инженерной инфраструктуры, элементы озеленения и благоустройства.

В элементы благоустройства и озеленения проектом предусматривается устройство тротуаров, пешеходных дорожек, устройство газонов, детской игровой и спортивной площадок, малых архитектурных форм, посадка деревьев и кустарников.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме №1 по г/п с пристроенным двухэтажным гаражом-стоянкой предлагаются:

**10 (десять)** однокомнатных квартир, **площадью от 28 до 36 кв. м включительно**, стоимость 1 кв. метра — **от 6 930 до 7 105 белорусских рублей**;

**7 (семь)** однокомнатных квартир, **площадью от 40 до 49 кв. м**, стоимость 1 кв. метра — **от 6 755 до 6 930 белорусских рублей;**

**3 (три)** двухкомнатных квартиры, **площадью от 58 до 61 кв. м**, стоимость 1 кв. метра — **от 6 510 до 6 580 белорусских рублей;**

**3 (три)** двухкомнатных квартиры, **площадью от 84 до 89 кв. м,** стоимость 1 кв. метра — **от 6 055 до 6 510 белорусских рублей.**

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3—7 календарных дней от даты следующей за днем регистрации договора долевого строительства в Комитете строительства и инвестиций Мингорисполкома.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Кристал», по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567, по графику пн-пт — с 9:00 до 18:00, сб, вс – выходной, тел. 375 (44) 711-33-00.

Приём заявлений на заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться с 9:00 18.02.2025 г. в порядке живой очереди в офисе продаж «Гранд Кристал» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567.

ЗАО «Центр промышленной оценки» (УНП 191021390) — проводит первые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже:

**зданий (лоты № 1 — 5),**
расположенных по адресу: **Гомельская обл., Мозырский р-н, Михалковский с/с, 146,**

принадлежащих ОАО «Мозырский спиртоводочный завод» (антикризисный управляющий — ООО «СтанИБор», (УНП 491343813) — производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) №118-10Б/2016).

С порядком оформления участия в аукционе, общими правилами проведения можно ознакомиться на www.bankrot.gov.by либо на сайте организатора аукциона www.cpo.by, и по тел: +375 (29) 805 93 30 (Светлана Павловна), +375 (29) 8717025 (Валерий Петрович)».

**Аукцион состоятся 26.02.2025 г. в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 512. Заявки принимаются с 9.00 11.02.2025 г. по 25.02.2025 г. до 17.00 по указанному адресу.

# СОНЕЙКІ НА ГАЛІНАХ

У ліманарыі Цэнтральнага батанічнага саду НАН Беларусі люты — час паспявання пладоў. На дворы — устойлівы «мінус», а тут — сапраўдны трапічны рай, напоўнены непаўторным водарам.











Растуць тут не толькі розныя сарты лімонаў, але і іншыя фруктовыя расліны паўднёвых шырот — ад маленькіх каламандзінаў, бананаў, апельсінаў і мандарынаў да велізэзных памела беларускай селекцыі. У шэрыя і халодныя зімовыя дні асабліва прыемна трапіць у гэты дзівосны свет субтрапічных раслін, дзе галіны цытрын згінаюцца пад цяжарам духмяных пладоў. Субтрапічную калекцыю ў батанічным садзе пачалі вырошчваць яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя, і цяпер яна налічвае больш за 120 відаў цытрусавых, бананаў, гранатаў, інжыру, фейхоа, папаі і іншых. Многія расліны яшчэ квітнеюць і падрастаюць, але большасць з іх ужо дорыць магчымасць убачыць іх саспелыя плады наведвальнікам, якіх, паводле самых сціплых падлікаў, толькі за мінулыя выхадныя было больш за тысячу чалавек.

**Віктар ДРАЧОЎ, фота аўтара.**



## Извещение о проведении **14 марта 2025 года** торгов **№ 1-РМ-25** на право размещения рекламы в подвижном составе, принадлежащем государственному предприятию «Минский метрополитен»

| № предмета торгов | Место размещения средства рекламы (согласно схеме) | Вид средства рекламы | Количество и размер средства рекламы | Материал изготовления средства рекламы | Срок действия договора | Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС) / сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215x315 мм | Рекламный плакат | Рекламный плакат формата А4 (210x297 мм). По первой линии в 31 составе: каждый 1, 2, 3, 4, 5 вагон верхний ряд места (1, 3, 5, 7, 9, (11), 13, 15, 17, 19, 21, 23, (25), 27, 29, 31, 33, 35, 37, 39) ВСЕГО: 2 790 ед. | немелованная листовая бумага без покрытия, плотностью 150-170 г/м² | с 1 апреля 2025 года по 31 марта 2028 года | 61 746,05 |
| 2 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215x315 мм | Рекламный плакат | Рекламный плакат формата А4 (210x297 мм). По первой линии в 31 составе: каждый 2, 4 вагон нижний ряд места (2, 4, 6, 10, 14, 18, 30, 36, 38, 40) ВСЕГО: 620 ед. | немелованная листовая бумага без покрытия, плотностью 150-170 г/м² | с 1 апреля 2025 года по 31 марта 2028 года | 5 729,79 |
| 3 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215x315 мм | Рекламный плакат | Рекламный плакат формата А4 (210x297 мм). По первой линии в 31 составе: каждый 2, 4 вагон нижний ряд места (8, 12, 16, 20, 22, 24, 26 ,28) ВСЕГО: 496 ед | немелованная листовая бумага без покрытия, плотностью 150-170 г/м² | с 1 июня 2025 года по 31 мая 2028 года | 4 583,83 |
| 4 | Рекламный плакат, размещаемый в информационном кармане SAN 215x315 мм. | Рекламный плакат | Рекламный плакат формата А4 (210x297 мм). По второй линии в 28 составах: каждый 1, 3, 5 вагон нижний ряд места (8, 12, 16, 20, 22, 24, 26, 28) ВСЕГО: 672 ед. | немелованная листовая бумага без покрытия, плотностью 150-170 г/м² | с 1 июня 2025 года по 31 мая 2028 года | 6 210,36 |

***Необходимые условия оплаты услуг по размещению рекламы:***

- цена продажи предмета торгов вносится в счет оплаты за оказание рекламных услуг по договору за 1-й месяц размещения;
- победитель торгов (лицо, приравненное к победителю торгов) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов обязан перечислить на счёт государственного предприятия «Минский метрополитен» обеспечение исполнения договора. Обеспечение исполнения договора предоставляется на сумму, равную сумме продажи предмета торгов и учитывается в счёт оплаты за оказание рекламных услуг по договору за 12-ый месяц (исполнение договора) или 1 (один) последний месяц при досрочном расторжении договора либо при отказе от исполнения договора;
- условием оплаты услуг по размещению рекламы является предоплата за текущий месяц в размере 100% в первые 3 рабочих дня текущего месяца;
- стоимость услуг по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и установленная договором, действует первые 12 месяцев размещения, в дальнейшем, ежегодно стоимость услуг по размещению рекламы пересчитывается путём увеличения на индекс потребительских цен;
- стоимость услуг по размещению рекламы в подвижном составе, определенная по итогам торгов и установленная договором, подлежит перерасчету в связи с изменением графика движения поездов в Минском метрополитене в летний период, а также в случае обновления действующего подвижного состава (изменения количества) пропорционально количеству вагонов подвижного состава.

***Необходимые условия по размещению рекламы:***

- не проводить размещение рекламы игорных заведений за исключением рекламы Республиканской мгновенной электронной лотереи «Белбет», Белорусской республиканской тиражной лотереи «То! Лото», Белорусской республиканской национальной спортивной лотереи «Суперлото», РУП «Белорусские лотереи», ЗАО «Спорт-пари».

**Государственное юридическое лицо** – коммунальное транспортное унитарное предприятие «Минский метрополитен», г. Минск, пр-т Независимости, 6, тел. (017) 383-83-60.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утверждённым Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 г. № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **14 марта 2025 г. в 11.00,** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, зал аукционов (каб. 7).

Документы на участие в торгах принимаются **с 11.02.2025 г. по 10.03.2025 г.** включительно, в рабочие дни – с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00), по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:

– заявление на участие в торгах;

– заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);

– копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах.

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, (назначение платежа – задаток для участия в торгах № 1-РМ-25 на право размещения средств рекламы по предмету торгов №_).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под подпись;

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет государственного предприятия «Минский метрополитен» сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг государственного предприятия «Минский метрополитен» по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором об оказании услуг по размещению рекламы);

- **в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор об оказании услуг по размещению рекламы с государственным предприятием «Минский метрополитен» (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:** отдел аукционов – (017) 360-42-22, рекламно-информационный отдел Минского метрополитена – (017) 383-83-60.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – www.mgcn.by (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); государственного предприятия «Минский метрополитен» – www.metropoliten.by, Минского городского исполнительного комитета – www.minsk.gov.by (раздел «Объявления – Аукционы»).

СПОРТ-ТАЙМ

# КУБАК БУДУЧЫНІ ЗАСТАЎСЯ Ў БЕЛАРУСІ

## У традыцыйным аглядзе — найлепшыя спартыўныя навіны

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** На базе Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы» прайшоў фінал рэспубліканскіх спаборніцтваў па біятлоне «Снежны снайпер» на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. У гэтым сезоне ў турніры прынялі ўдзел больш за 14 тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак, якія не займаюцца біятлонам у спецыялізаваных установах. Да рэспубліканскага фіналу дайшлі 168 найлепшых юных спартсменаў. Удзельнікі фіналу разыгралі ўзнагароды ў спрынтах, гонках з масавым стартам і змешаных эстафетах у трох узроставых катэгорыях: малодшай (2014—2015 г. н.), сярэдняй (2012—2013 г. н.) і старэйшай (2010—2011 г. н.). Перамогу ў медальным заліку атрымала зборная Мінска, спартсмены якой заваявалі 18 узнагарод (8 залатых, 6 сярэбраных і 4 бронзавыя). Другое месца па колькасці прызавых месцаў заняла каманда Магілёўскай вобласці (2-5-3), шэсць узнагарод у скарбонцы прадстаўнікоў з Брэсцкай вобласці (1-2-3).



**ГЕРОІ ТЫДНЯ.** Хакеісты маладзёжнай зборнай Беларусі ў трэці раз запар сталі пераможцамі Кубка Будучыні, розыгрыш якога прайшоў на «Чыжоўка-арэне». У фінале зборная Беларусі U20 сустрэлася са зборнай Расіі-U18, якія раней нанеслі паражэнні камандам Беларусі-U18 і Расіі-U17. З вынікам 2:1 перамаглі беларусы. Бронзавыя медалі заваявалі хакеісты беларускай юніёрскай зборнай, якія абгулялі каманду Расіі-U17 з лікам 3:1.

**КАМАНДА ТЫДНЯ.** Рэзервісты баскетбольнага клуба «МІНСК» пераможна завяршылі 14-матчавую дамашнюю серыю ў Адзінай маладзёжнай лізе ВТБ. У заключным матчы серыі мінчане другі раз запар абыгралі краснаярскі «Енісей» — 72:66. У першай сустрэчы вынік быў 100:76 на карысць беларускіх баскетбалістаў. У 34 праведзеных сустрэчах рэзервісты «МІНСКА» набралі 50 ачкоў і знаходзяцца на 7-м месцы ў турнірнай табліцы. Чатыры наступныя паядынкі беларускія баскетбалісты правядуць на выездзе: 26 і 27 лютага ў Пермі з «Пармай», 2 і 3 сакавіка ў Екацярынбургу з «Уралмашам».

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** Сямёра беларускіх лёгкаатлетаў сталі пераможцамі міжнародных спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы ў памяшканні «Руская зіма». Пераможцамі спаборніцтваў сталі Эльвіра Грабарэнка (60 м з бар'ерамі), Яніна Луцэнка (60 м), Карына Дзямідзік (скачкі ў вышыню), Алена Дубіцкая (штурханне ядра), Віталь Парахонька (60 м з/б), Ілья Карнаухаў (1500 м) і Алег Тамашэвіч (штурханне ядра). Бронзавы медаль у бегу на 60 метраў з бар'ерамі заваявала Руслана Раманоўская, таксама на трэцюю прыступку п'едэстала ў скачках у даўжыню сярод юніёрак паднялася Шанон Кам-Крыстал. Усяго традыцыйны зімовы турнір сабраў каля 250 лёгкаатлетаў з Беларусі, Расіі, Турцыі, Алжыра, Эфіопіі, Казахстана і Егіпта.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** Беларускі барэц Абубакар Хаслаханаў заняў другое месца на рэйтынгавым турніры Zagreb Open 2025. Спартсмен, які выступае ў катэгорыі да 97 кг, упэўнена дайшоў да фіналу, дзе саступіў расіяніну Артуру Саргсяну. Год таму на турніры ў Заграбе Хаслаханаў быў пераможцам.

**ПЕРАМОГА ТЫДНЯ.** Беларускі спартсмен Арцём Плоніс стаў пераможцам міжнародных спаборніцтваў па тхэквандо Fujairah Open, якія прайшлі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Беларускі спартсмен стаў наймацнейшым у вагавой катэгорыі звыш 87 кг. Найбуйнейшым дасягненнем Арцёма Плоніса на міжнародных стартах з'яўляецца бронзавы медаль чэмпіяната свету па тхэквандо 2023 года.

**Валерыя СЦЯЦКО.**






Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

НАДВОР'Е

# ЛЮТЫ ПАКАЗВАЕ СВОЙ НОРАЎ

## Пры праясненнях — да 16 марозу

Снежны і марозны характар надвор'я захаваецца і ў другой дэкадзе лютага, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.



У аўторак чакаецца перавага воблачнага надвор'я, без істотных ападкаў. Месцамі будзе згушчацца слабы туман. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Вецер няўстойлівы — ад слабага да ўмеранага. Тэмпература паветра мінімальная ноччу мінус 7 — мінус 13 °C, а максімальная днём ад 1 да 7 °C з мінусам.

У сераду і чацвер таксама прагназуецца пераважна без ападкаў. Месцамі могуць быць слабы туман, шэрань, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — мінус 6 — мінус 12 °C, пры праясненнях — да мінус 16 °C. Максімальная тэмпература днём складзе ад мінус 6 да плюс 1 °C.

Паводле папярэдніх прагнозаў, няўстойлівыя паветраныя масы арктычнага паходжання працягнуць утрымліваць зімовы характар надвор'я з тэмпературным фонам на некалькі градусаў ніжэй шматгадовай нормы ў пятніцу і ў наступныя выхадныя.

У пятніцу месцамі па краіне пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Мінімальная тэмпература паветра ноччу складзе мінус 5 — мінус 12 °C, пры праясненнях — да мінус 14 °C, максімальная днём — мінус 6 — плюс 1 °C.

У суботу ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег. На асобных участках дарог можа быць галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — мінус 6 — мінус 12 °C, пры праясненнях — да мінус 15 °C. Тэмпература днём будзе ад нуля да 7 марозу.

У нядзелю ў асобных раёнах краіны пройдзе невялікі кароткачасовы снег, на асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Тэмпература ўначы — мінус 8 — мінус 13 °C, пры праясненнях — да мінус 16 °C, максімальная днём — мінус 1 — мінус 8 °C.

**Сяргей КУРКАЧ.**

11 ЛЮТАГА Даты Падзеі Людзі

У краіне

**1882** год — нарадзіўся (г. Мінск) Леў Урбанавіч Дашкевіч, беларускі фотамастак, вучоны, педагог. З 1920 года выкладаў беларускую мову і літаратуру, сусветную літаратуру, французскую мову ў Мінскім інстытуце народнай адукацыі, Беларускім політэхнічным інстытуце, Мінскім архітэктурна-дарожнабудаўнічым тэхнікуме, БДУ і сярэдніх школах г. Мінска. Упершыню ў Беларусі распрацаваў і ўвёў у ВНУ курс лекцый па фатаграфіі і факультатыўны курс «Фатаграфія і яе выкарыстанне ў тэхніцы». Працаваў у розных жанрах мастацкага фота (пейзаж, партрэт, нацюрморт).

**1944** год — нарадзіўся Ігар Уладзіміравіч Уласаў, беларускі жывапісец. Аўтар тэматычных карцін «Лета 1945 года», «Урок жывапісу», пейзажаў «Стары Мінск», «Канец лета» і інш.

**1959** год — у Мінску адбылося першае прадстаўленне ў новым будынку Беларускага дзяржаўнага цырка. Гэта дата лічыцца днём нараджэння сучаснага беларускага цырка.

У свеце

**1829** год — разня ў рускім пасольстве ў Тэгеране. Сярод загінулых быў і кіраўнік дыпмісіі пісьменнік Аляксандр Грыбаедаў.

**1894** год — нарадзіўся Віталій Валянцінавіч Біянкі, рускі савецкі пісьменнік. Аўтар навукова-мастацкіх кніг для дзяцей аб жыцці прыроды.

**1929** год — у Латэранскім палацы ў Рыме кардыналам П'етра Гаспары і прэм'ер-міністрам Італіі Беніта Мусаліні, які дзейнічаў ад імя караля Віктара Эмануіла, падпісаны пагадненні паміж Святым прастолам і Італіяй, якія паклалі пачатак існаванню суверэннай папскай дзяржавы — Ватыкану.

**1940** год — пачатак прарыву лініі Манергейма Чырвонай Арміяй у Зімовай вайне, які завяршыўся капітуляцыяй Фінляндыі.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 382. Індэкс 63850. Зак. № 420.

Нумар падпісаны ў 19.30 10 студзеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12